Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 333 (4239)
Аўторак, 15 сьнежня
1931 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—2-я сэсія ЦВК (1 стар.).
Е. Б. ПАШУКАНІС—Аўладаць марксыцка-ленінскай тэорыяй (2 стар.).
П. ЧЬКУН—Лічбы галасуюць за аграмінімум (3 стар.).
Замарожваньне таваразвароту дэзарганізуе рабочае снабжэньне (1 стар.).
Ударныя брыгады калгасу імя Будзённага паказваюць узоры апрацоўкі ільну (1 стар.). Забясьпечыць нармальную зімоўку ўсяго конскага парку (1 стар.).
АГЛЯД ДРУКУ—Сон на баявым посту (2 стар.).
Рашуча выкрываць апартуністаў, якія патураюць кулацкім тэндэнцыям, накіраваным на зрыў пляну збожжазагатовак (2 стар.).
У выніку недаацэнкі ўказаньняў правадыра патчашны камбінат імя КІМ працуе па-старому (3 стар.).
Вагон павінен працаваць 8 гадзін у суткі (3 стар.).
ПОЛЬШЧА:
Масавая расправа польскага фашызму над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі (4 стар.).

Другая сэсія ЦВК БССР

Сёньня адкрываецца другая сэсія ЦВК БССР. Яна склікаецца на парозе чацьвертага, заключнага году пяцігодкі. На парадку дня—такой выключнай важнасьці пытаньні, як кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі на 1932 г., бюджэтна-фінансавы план, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і масавая работа саветаў. У сьвятле гэтага чарговая сэсія ЦВК набывае вялізарнае палітычнае значэньне.

Прыступаючы да прапрацоўкі кантрольных лічбаў народнай гаспадаркі на будучы год, сэсія надвядзе вынікі трэцяга рашаючага году пяцігодкі. На аснове вялізарнага вопыту сацыялістычнага будаўніцтва ў папярэднія гады, кіруючыся выразнымі дырэктывамі партыі, яна намеціць канкрэтныя шляхі пасьпяховага руху наперад да сацыялізму.

Аб чым гаворыць практыка сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе і ў яго складанай частцы—БССР?

Яна сьведчыць аб нябывалых у гісторыі дасягненьнях, заваяваных рабочай клясай, калгасьнікамі, працоўнымі масамі нашай краіны, пад кіраўніцтвам сталёвай бальшавіцкай партыі. Яна зьяўляецца бліскучым доказам правільнасьці генэральнай лініі партыі і яе нацыянальнай палітыкі, банкрутства надзей ворагаў унутраных і зьнешніх, поўнага паражэньня апартуністычных элемэнтаў, якія ня верацьць у творчыя сілы пралетарыяту, агітуюць за аслабленьне тэмпаў, цягнуць краіну назад.

У той час, як нашы заходнія суседзі краіны капіталу задыхаюцца ў ціскох эканамічнага крызісу, народжанага капіталізмам, мы расьцем гігантскімі крокамі, пячуваньнямі тэмпамі разьвіваем вытворчыя сілы краіны. Там—дзесяткамі закрываюцца фабрыкі, выкідваюцца на вуліцу тысячы і мільёны беспрацоўных, асуджаных на голад і холад. У нас—адкрываюцца ўсё новыя і новыя прадпрыемствы, поўнасьцю ліквідавана беспрацоўе, бязупынна паляпшаецца дабрабыт рабочай клясы, калгасьнікаў і ўсіх працоўных. У Заходняй Беларусі працоўныя сялянскія масы, якія стогнуць пад ярмом польскага фашызму, эксплёатуюцца польскімі, беларускімі памешчыкамі і кулакамі, руйнуюцца ўсё больш і больш. У Савецкай-жа Беларусі — звыш 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аб'ядналася ў калгасы, змагаецца пад кіраўніцтвам партыі за буйное сацыялістычнае, высокатаварнае зямляробства, ліквідуючы кулацтва як клясу, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Пяцігадовы план мы выконваем рэкордныміі тэмпамі. Рад галін прамысловасьці ўжо выканаў яго менш чым у чары гады. Аб ажыцьцяўленьні пяцігодкі ў такі ўшчульнены тэрмін будзе рапартаваць сэсіі наша шэйная прамысловасьць, рад фабрык і заводаў іншых галін. Аб вялізарных посьпехах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі будуць дакладваць кадэгаўнікі армії работнікаў сацыялістычнага зямляробства.

У чым сакрэт нашых перамог, пасьпяховага выкананьня рашаючай часткі пяцігодкі?

Ён хаваецца ў няўхільным ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі і яе ЦК, у жорсткай барацьбе з правымі і «левымі» апартуністамі. Грандыёзны творчы ўздым шырокіх працоўных мас, магутнае разьвіцьцё новых сацыялістычных мэтадаў працы, актыўны ўдзел самых шырокіх пластоў працоўных у сацыялістычным будаўніцтве — вось тыя вагары, якія партыя здолела прывесьці ў рух для атрыманьня рашаючай перамогі.

Народна-гаспадарчы план наступнага году, які прапрацоўвае зацьвердзіць сэсія, павінен забясьпечыць поўную перамогу на фронце пяцігодкі ў 1932 годзе. Чацьверты, заключны будзе годам рашучага замацаваньня і пашырэньня сацыялістычнага будаўніцтва. Яго асноўная асаблівасьць заключаецца ў канкрэтнай праграме барацьбы ня толькі за колькасьць, але асабліва за якасьць. Расьці ня толькі ў шырыню, але і ўглыбіню—асноўны лёзунг чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Выкананьне гэтай задачы забясьпечвае рэалізацыя гістарычных шасьці ўмоў тав. Сталіна. А гэта азначае, што цэнтральнымі пытаньнямі пляну 1932 г. павінна быць барацьба за работу па-новаму, за якасьць і тэхніку, за ліквідацыю абязьлічкі і ўраўнілаўкі. Гаспадарчы разрахунак, зьніжэньне сабекошту і павышэньне прадукцыйнасьці працы, памяншэньне браку і эканомія сыраду і апалу—важнейшыя праблемы, за вырашэньне якіх павінны штодзённа змагацца ўсе галіны прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Кантрольныя лічбы БССР на наступны год прадугледжваюць далейшае павышэньне вядучай ролі індустрыі.

Другім асноўным пытаньнем зьяўляецца арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і далейшыя посьпехі у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Паляпшэньне матар'яльнага і культурнага ўзроўню рабочай клясы і калгасьнікаў—трэці цэнтральны момант народна-гаспадарчага пляну на чацьверты год пяцігодкі.

Як баявая задача стаіць пытаньне аб павялічэньні эфэктыўнасьці капітальнага будаўніцтва, аб максымальным скарачэньні тэрмінаў пуску ў эксплёатацыю новых аб'ектаў. Важнейшым шляхі пасьпяховага выкананьня гэтай умовы—пераход да шырокага стандартнага будаўніцтва, максымальнае скарыстаньне мэханізмаў, якія спрыяюць павышэньню прадукцыйнасьці працы.

Напрамак разьвіцьця нашай краіны акрэсьлівае энэргетыка, тарфяная, мэталяапрацоўчая, будаўнічая, лесахэмічная, тэкстыльная, харчовая і паяровая прамысловасьць, а па лініі сельскай гаспадаркі—жывёлагадоўля і тэхнічныя культуры.

Вялізарная ўвага аддаецца энэргетыцы, разьвіцьцю тарфянай прамысловасьці. Перад намі праблема—ужо ў 1932 г. зусім адмовіцца ад завозу апалу з іншых частак Савецкага Саюзу і цалкам перайсьці на мясцовы апал. Торф высоўваецца на першае месца. Рэспубліканская мясцовая прамысловасьць павінна будзе здабыць 2 млн. тон тарфянога апалу. Задача рэальная, але для яе выкананьня трэба намагчы ўсе сілы і скарыстаць усе магчымасьці, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на поўную загрузку мэханізмаў і сілавых установак. 1932 год павінен таксама пакласьці пачатак разгортваньню прамысловасьці па хэмічнай апрацоўцы торфу.

1932 год будзе годам далейшага росту ня толькі колькасных, але і значных якасных паказьнікаў сельскай гаспадаркі. Калгаснік ужо стаў цэнтральнай фігурай зямляробства. Заваяваньня дасягненьні ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ўжо забясьпечылі значныя посьпехі ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці, павышэньне ўраджайнасьці, уздым таварнасьці. Аднак, не выкарыстоўваюцца яшчэ тыя магчымасьці разьвіцьця высока-таварнай гаспадаркі, якія забясьпечваюцца буйной калектыўнай гаспадаркай, умовамі савецкага ладу і тэй вялізарнай вытворчай дынамогай, якая аказваецца калгасам з боку пралетарскай дзяржавы» (з пост. аб'ядн. лістапад. пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Партыя выразна падкрэсьліла, што толькі па аснове шырока разгорнутай работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і барацьбы з самацёкам у калгасным будаўніцтве. будзе вырашана задача завяршэньня суцэльнай калектывізацыі, уздыму таварнасьці сацыялістычнага зямляробства на нябывалую вышыню. Перавыхаваньне калгасных мас і выкарчоўваньне дробна-буржуазных тэндэнцый, правільная арганізацыя працы і сапраўднае ўкараненьне зьдзельшчыны, узьняцьце ўраджайнасьці і прадукцыйнасьці жывёлы—гэта важнейшыя задачы ўзьняцьця калгаснай вытворчасьці.

У наступным годзе пасеўная плошча БССР павялічваецца да 4.150 тыс. га. супроць 3.570 тыс. у бягучым годзе. Пасеўная плошча саўгасаў павялічваецца ў два разы і дасягне 800.000 гэкт. Вялізарны рост дадуць пасевы пад тэхнічныя культуры: 370 тысяч гэкт. ільну і капапель супроць 270.000 у 1931 г. Стада буйной рагатай жывёлы павялічваецца па 35 процантаў, сьвіней—на 40 проц.

Шпаркімі тэмпамі ідзе тэхнічнае пераўзбраеньне сельскай гаспадаркі. Далей адзначыць, што ў наступным годзе наш трактарны парк будзе даведзен да 10.000 машын (у пераводзе на 10-цісільныя) супроць 2.340 трактараў, якія намячаліся мець у канцы пяцігодкі. Іншых сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару завозіцца на 27.500 тыс. руб. супроць 15.000 тыс. руб., выдаткаваных на гэту мэту сёлета.

Народна-гаспадарчы план чацьвертага, заключнага прадугледжвае вялікі рост культурнага будаўніцтва. Варта адзначыць хаця-б такі факт, як пераход на абавязковае ўсеагульнае навучаньне, масавая ліквідацыя тэхнічнай маланісьвешчасьці, каб уявіць сабе грандыёзнасьць мерапрыемстваў у разгортваньні культурнай рэвалюцыі. Да гэтага трэба дадаць шыят мерапрыемстваў па паляпшэньні быту і здароўя рабочай клясы і калгасьнікаў, як адкрыцьцё новых больнічных пунктаў, дамоў адпачынку, ясьляй, пашырэньне камунальнага будаўніцтва, грамадзкага харчаваньня і г. д. Усё гэта мае мэтай стварыць больш здаровыя ўмовы працы, павысіць яе прадукцыйнасьць, палепшыць дабрабыт рабочых і калгасьнікаў.

Бюджэт БССР цалкам адбівае тыя вялізарныя зрухі, якія адбудуцца ў нашай народнай гаспадарцы на працягу 4-га, заключнага году пяцігодкі. Расходная частка складае 857,8 млн. рублёў—на 73,9 проц. больш, чым у 1931 годзе. З гэтай сумы 760 млн., або 88,5 проц. выдаткоўваецца на індустрыяльна-прамысловае, сельска-гаспадарчае і культурнае будаўніцтва, прычым амаль палова ўсіх выдаткаў (403,7 млн. рублёў) накіроўваецца на капітальнае будаўніцтва. Дзевяць дзесятых бюджэта выдаткоўваецца на гаспадарку і культуру, у той час, як у краінах капіталу большая частка асыгнаваньняў ідзе на вайсковыя патрэбы.

Вялізарныя сродкі асыгнуюцца на паляпшэньне бытавых умоў, асабліва ў пралетарскіх цэнтрах. На жыльлёвае будаўніцтва—44 млн. рублёў—на 91,7 проц. больш, чым у 1931 г. На сацыяльна-культурныя мерапрыемствы—294,4 млн. рублёў—рост на 104 проц.

Асобным пытаньнем стаіць даклад аб масавай рабоце саветаў. Сельсаветы яшчэ не павярнуліся тварам да арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, а некаторыя з іх засмечаны кулацкімі элемэнтамі. Усебеларуская нарада гарсаветаў, якая адбылася нядаўна ў Менску, паказала, што ў большасьці гарсаветаў з разгортваньнем масавай работы справа таксама стаіць нездавальняюча.

Сэсія на аснове вопыту лепшых гарсаветаў і сельсаветаў намеціць практычныя мерапрыемствы да ажыўленьня масавай работы саветаў. Саветы павінны прыняць усе неабходныя меры для неадкладнай ліквідацыі адставаньня на вучастку загатовак. Неабходна дабіцца такога становішча, каб саветы сапраўды сталі на чале перабудовы ўсёй работы па-новаму, каб усе сельсаветы ўзначалілі барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Работа 2-й сэсіі ЦВК БССР павінна прыцягнуць асаблівую ўвагу рабочай клясы, калгасьнікаў, працоўных мас нашай краіны. Гэтага патрабуюць грандыёзныя задачы, якія высоўвае 1932 год. А ў гэтым чацьвертым, заключным годзе пяцігодкі павінны быць ажыцьцёўлены такія мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі стварэньне адпаведнай базы для пасьпяховага разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры на працягу новай, другой пяцігодкі.

Вялізарныя посьпехі, дасягнутыя рабочай клясай і калгасьнікамі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва ў 3-м рашаючым годзе, зьяўляюцца запукай таго, што народна-гаспадарчы план чацьвертага, заключнага будзе выкананы. Цьвёрдае кіраўніцтва ленінскай камуністычнай партыі і яе ЦК, творчы энтузіязм і воля шырокіх працоўных мас да перамогі сацыялізму—гарантыя таго, што ў 1932 г. пяцігодка будзе ня толькі выканана, але і перавыканана. Рашучай барацьбой з клясавым ворагам і яго агентурай у партыі—правымі і «левымі» апартуністамі—мы даб'емся новых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Замарожваньне таваразвароту дэзарганізуе рабочае снабжэньне

Пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР накант выяўленых фактаў затаварваньня і злачынна-нядбайнай нагрузкі тавараў завастрае ўвагу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці на патрэбнасьць узмацніць барацьбу з рашткамі нэпманскіх тэндэнцый у паасобных зьвеньнях спажывецкай кааперацыі і дзяржаўнага гандлю.

Даныя аб таваразвароце па БССР сьведчаць аб тым, што кааперацыйна-гандлёвыя арганізацыі вельмі слаба змагаюцца за ўзьняцьце якасьці гандлю, за паскарэньне таваразвароту, супроць яго замарожваньня.

Астачы тавараў ня толькі не памяншаюцца, але нават маюць тэндэнцыі да павялічэньня. На 1-га сьнежня ёсьць замарожаных тавараў на мільёны рублёў. Плян таваразвароту па гарадзкім і сельскім сэктарох кааперацыі за 4-ы квартал выкананы усяго на 51 проц., прычым сельскі сэктар выканаў заданьне ўсяго на 42,2 проц.

На галмітарэйна-трыкатажным аб'яднаньні Белкаапсаюзу таварныя астачы складаюць замест 154 тыс. руб. — 326 тыс. руб.; па скураным аб'яднаньні адпаведна — 164 тыс. руб. і 368 тыс. руб. і г. д. На базах Белкаапсаюзу таварная астача па 1-га сьнежня складае 2.009 тыс. руб. супроць 1.500 тыс. руб. на пляне.

Па многіх зьвеньнях спажывецкай кааперацыі наглядаецца злачыннае парушэньне тэрмінаў звароту тавараў. Па гарадзкох тэрмін звароту тавараў замест 14 дзён па пляне, па 1-га лістапада дасягнуў 18 дзён. Значна горш па сельскай сетцы, дзе тэрмін таваразвароту замест 18 дзён дасягае ў сярэднім 30,4 дня, а па асобных раёнах, як Барысаўскі — 58 дзён, Бы хаўскі — 33, Віцебскі — 37 дзён.

Вялізарныя астачы тавараў па нізавых зьвеньнях спажыўкааперацыі гавораць аб выключна марудным перабудове работы і злачынным ігнараваньні сапраўднага гаспадарчага разрахунку.

Замарожваньню таваразвароту ў значнай ступені спрыяе налўнасьць у паасобных зьвеньнях кааперацыйна-гандлёвага апарату бюракратычных і нэпманскіх элемэнтаў, якія перашкаджаюць разгортваньню савецкага гандлю і паляпшэньню абслугоўваньня спажыўца.

Толькі перабудаваўшы рабочае снабжэньне на аснове сапраўднага савецкага гандлю можна забясьпечыць задавальненьне ўзросшых матар'яльных і культурных патрабаваньняў рабочага і яго сям'і. Замарожваньне-ж таваразвароту вядзе да дэзарганізацыі рабочага снабжэньня.

Трэба ўзмацніць барацьбу з усімі скажэньнямі савецкага гандлю, з «лявацкімі» тэндэнцыямі мэханічнага размеркаваньня і права-апартуністычнымі праяўленьнямі нэпманскага духу ў кааперацыйным і дзяржаўным гандлі.

Я. Х.

УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ КАЛГАСУ ІМЯ БУДЗЁННАГА

ПАКАЗВАЮЦЬ УЗОРЫ АПРАЦОЎКІ І ЗДАЧЫ ІЛЬНУ

Палепшыць якасьць апрацоўкі ільну

Савет Працы і Абароны ў сваёй пастанове ад 19 лістапада г. г. аб уборцы, апрацоўцы і здачы ільну абавязаў загатоўчыя арганізацыі і Калгасыстэму зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць валакна, на апрацоўку трасты пасьля мяцьця.

Гэта пытаньне набывае зараз асаблівае значэньне, паколькі вёсткі з'месц гаворацьць аб выключна ніз кай якасьці ільну.

Дрэннае валакно паступае ня толькі ад аднаасобнага сэктару, але і ад калгасаў, прычым па асобных раёнах мы маем недапушчальна высокі процант здаванай пакулі. Калгас «Новы сьвет», Сіроцінскага раёну, здаў з аднэй асеці 2-3 пуды валакна і 3-4 пуды пакулі. На Шумілінскую базу паступае лён у сярэднім 5-га і 6-га нумароў, у той час, як з раёну дзейнасьці гэтай базы павінен паступаць лён значна лепшай якасьці.

Загатоўчыя арганізацыі дагэтуль мала цікавіліся якасьцю валакна: абы здаць, зусім ня важна, ці будзе валакно шостага ці дванаццатага нумару. Ёсьць імкненьне выканаць заданьне за лік павялічэньня кастры.

На такіх зьвяшчах трэба рашуча ўдарыць. Неабходна мабілізаваць усю грамадзкасьць вакол пытаньня палепшэньня апрацоўкі ільнаводчай прадукцыі.

Загатоўчыя абавязаны ў максымальнай ступені ўжываць сродкі, якія стымулююць павышэньне якасьці, шырока практыкаваць павышаную норму выдачы тавараў калгасьнікам за лепшую апрацоўку.

У тых калгасах, дзе яшчэ ня скончана апрацоўка, павінны быць створаны брыгады трацоў. Праўленьні калгасаў абавязаны праверыць усю наяўнасьць трэснага валакна ў калгасах, у мэтах зьмяншэньня кастры і хутчэйшай здачы валакна павышанай якасьці.

Задача праўленьняў шырока растлумачыць гэта пытаньне на сходах калгасьнікаў і беднякоў і серадняковў—аднаасобнікаў.

Н. Брэль, А. Зосім.



Падача ільну ў трохвальную мялку, працуючую конным прыводам. Ля, машыны ўдарніцы Яршова і Максімушкіна.

У авангардзе ільназагатовак

Калгас імя Будзённага, Дрысенскага раёну па-ўдарнаму арганізаваў апрацоўку і здачу ільна-валакна і іншых культур. Уражнай ільну з 45 га поўнасьцю рэалізаваны да 5 сьнежня: здана 30 тон трасты і 100 пудоў валакна.

На працягу 10 дзён, брыгада калгасьнікаў апрацавала 16 цэнтнэраў ільна-валакна па якасьці 10-га і 11-га нумароў. Нормы мяцьця і трапаньня перавыконваюцца. Калгасьнік-ударнік ХАРЫТОН КУЗЬМІЧ, 57-мі год, пры норме трапаньня ў 10 кілёграм, апрацоўваў звыш 16; Сьцяпан Шчасны — 16 і больш.

Калгас здаў ільнасеньня 65 цэнтр., ці 107 проц. пляну.

Праўленьне Белкалгасцэнтру паста навіла выдаць старшыні калгасу імя Будзённага тав. КУЗЬМІЧУ за правільнае кіраўніцтва пераапрацоўкай ільну і датэрміновае выкананьне пляну премію ў 100 руб. Калгас прэміяваны жнівяркай. У распарадканьне праўленьня калгасу пераведзена 300 руб. для прэміяваньня лепшых калгасьнікаў-ударнікаў па апрацоўцы ільну.

Ударная камсамольская брыгада ў складзе т. т. Н. ШЧАСНАЙ, Ф. АМБРУЖЭВІЧ, Г. АПАЛКА і Г. РАМАНЮЎСКАЙ за ўдарную работу па ўборцы ільну і арганізаваную дапамогу калгасу «Праўда» і саўгасу «Бігосава» прэміявана бібліятэкай.

Праўленьне Калгасцэнтру заклікала ўсе калгасы БССР, па прыкладзе калгасу імя Будзённага, па-бальшавіцку арганізаваць апрацоўку і датэрміновую здачу ільна-валакна дзяржаве.

Ільнамялкі—на дзьвёхзьменную работу

АСЬВЕЯ.

Калгас «Новы шлях», Асьвейскага раёну, праводзіць рад мер для ўзмацненьня тэмпаў апрацоўкі і здачы ільну дзяржаве. Арганізаваны брыгады, якія прымацаваны да ільнамялак. Апошнія пераведзены на дзьвёхзьменную работу. Створаны 4 брыгады па трапаньні ільну.

Калгасьнікі абавязаліся на працягу бліжэйшых дзён прамяць 470 цнт. трасты. Вызначаны нормы выпрацоўкі на аснове зьдзельшчыны.

Разгортваецца сацэспаборніцтва паміж брыгадамі і паасобнымі калгасьнікамі на лепшыя паказальнікі якасьці апрацоўкі ільну.

Для прэміяваньня ўдарнікаў вызначан спэцыяльны фонд.

Калгас «Новы шлях» выклікаў на сацэспаборніцтва калгас імя Калініна.

Калгасьнік.

Мацней націск на кулака і заможніка!

КРУПКІ. У Крупскім раёне кулацка заможнымі гаспадаркамі ня здана ні аднаго кілёграма ільну на цьвёрдых заданьнях. Гэта тлумачыцца тым, што як з боку асобных сельсавету, парт'ячэек, так і загатоўчых арганізацый няма адпаведнага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі.

Па Ўгрушчынскім сельсавеце цьвёрдыя заданьні яшчэ не даведзены да кулацка-заможнага двара. Па Крупскім, Бобрскім, Ухвальскім, Хацкоўскім і іншых сельсаветах цьвёрдыя заданьні хоць і даведзены, але ніякіх мер ня ўжываецца для іх спагнаньня.

Гэтыя факты патураньня кулаку і заможніку даюць ім магчымасьць разбазарваць лён і ня выконваць пляну загатовак.

А. Вясковы.

Патрэбна ўмяшальнасьць РСІ

СУРАЖ. У Сураскі раён для стымуляваньня загатовак ільну спажыўсаюз завёз за апошнюю дэкаду паступныя прамтавары: дзесяць сырынак летніх дзіцячых шапак, па 10.000 руб. дзіцячай вопраткі і на 15.000 руб. папярос. Вось і ўсё. Завоз гэтага абураючага асартымэнту тавараў для стымуляваньня загатовак мяжуе са шкодніцтвам. РСІ і пракуратура павінны неадкладна расьследаваць гэты факт, якія адносіны да гэтага зьявішча мае Белкаапсаюз і прыняць належныя меры ў адносінах да вінаватых.

Загадзкі.

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ НАРМАЛЬНУЮ ЗІМОЎКУ УСЯГО КОНСКАГА ПАРКУ

У Крупках і Ўваравічах не змагаюцца з незаконным забоем коняй

Ударыць па недаацэнцы конскай цягі

Барацьба за высокі ўраджай у першую чаргу патрабуе правядзеньня сяўбы ў максымальна кароткі тэрмін. Практыка мінулай вясны, паказвае, што там, дзе расьцягваліся тэрміны сяўбы, мы мелі зьніжэньне ўраджайнасьці. Гэта абавязвае ўсе раённыя арганізацыі ўжо зараз пачаць падрыхтоўку да вясны і ў першую чаргу дабіцца таго, каб конскі парк быў забясьпечан належнымі памяшканьнямі і зімоўка праведзена ў нармальных умовах.

Пралетарская дзяржава з кожным годам павялічвае завоз трактараў у калгасы і саўгасы, але гэта не азначае, што мы сёньня можам адмовіцца ад паслуг каня. У веснавую пасеўную кампанію конская цягавая сіла будзе ў значнай ступені вырашаць пасьпяховае праведзеньне сяўбы.

Недаацэнка конскай цягі, грае толькі на руку клясаваму ворагу. Такім настроям павінна быць абвешчана рашучая барацьба.

Матар'ялы, якія мы сёньня друкуем з Крупскага і Ўваравіцкага раёну, зьяўляюцца вельмі яркім прыкладам недаацэнкі конскай цягавай сілы. Недаацэнка гэта прывяла да таго, што некаторыя калгасы паказаных раёнаў сустрэлі зіму непадрыхтаванымі. Коні засталіся без памяшканьняў і пад адкрытым небам. Адсутнасьць уліку конскага складу і абязьлічка прывялі таксама да таго, што коні ходзяць па палёх бясспрытульнымі.

Настроі аб тым, што трактар хутка і цалкам заменіць каня, далі магчымасьць клясаваму ворагу павесьці шкодніцкую работу за забой коняй і разбазарваньне іх.

Так, праўленьне калгасу імя Молатава (Ўваравіцкі раён) на тэй падставе, што ім абяцалі вясной прыслаць трактар, парашыла прадаць 26 коняй. Дырэктар саўгасу «Крупкі» (Крупскі р.), намецёў для выбракоўкі 14 коняй, сярод якіх аказалася 13 працаздольных. У гэтым жа раёне кулакі без дазволу вэтпункту забілі 2-х коняй. Пад уплывам кулацкай агітацыі мы маем факты і ў аднаасобным сэктары разбазарваньня коняй.

На жаль, рад раённых арганізацый не вядуць рашучай барацьбы з гэтымі фактамі, ня прымаюць належных мер у адносінах да апартуністычных элемэнтаў, якія заселі ў некаторых калгасах і саўгасах і ня хочуць рыхтаваць конскі парк да веснавой пасеўнай кампаніі.

«Зьвязда ня раз пісала, што конь яшчэ доўга будзе таварышом трактару. Таму раённыя арганізацыі павінны панесьці рашучы ўдар па ўсялякіх правах недаацэнкі конскай цягі, разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў за захаваньне ўсяго пагалоўя коняй у працаздольным стане да вясны, неадкладна дабіцца ліквідацыі абязьлічкі, правесьці дакладны ўлік коняй на ўсіх калгасах. Ускласьці адказнасьць за наяўнасьць і здароўе коняй на канкрэтных асоб. Стварыць спэцыяльныя брыгады для рамонту і ўцяпленьня. Разгарнуць будаўніцтва новых і прыстасаваньне старых будынкаў для коняй. У бліжэйшы час дабіцца таго, каб ні адзін конь не застаўся пад адкрытым небам.

Адначасова неабходна павесьці рашучую барацьбу з незаконным забоем коняй. У гэтых адносінах апублікаваная пастанова ЦВК і СНК СССР («Известия» № 340) «Аб забароне забою коняй...» набывае асабліва важнае значэньне. Усе правы, якія дае гэта пастанова, РВК павінны цалкам скарыстаць і прыцягваць да суровай адказнасьці вінаватых за галавацяпскія адносіны да коняй.

Камуна «Чырвоная Зорка», (сярэдняя Волга), для паляпшэньня догляду коняй правяла прэміяваньне лепшых канюхоў. На здымкі так, Хрошын лепшы конюх.

Кулацкія агенты за работай

КРУПКІ. (Наш кар.). На гледзячы на налўны недахват конскай сілы для свалачаговага правядзеньня веснавой сяўбы па раёне, крупскія раённыя арганізацыі не вядуць шырокай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў супроць барбарскіх адносін да каня і не змагаюцца з масавым разбазарваньнем.

У раёне арганізаваны тры выбракавачных пункты, на якіх вэтработнікі выбракоўваюць нягодных для работы коняй. Толькі за 2 дні на Крупскі вэтпункт было прыведзена 240 коняй. Але дзякуючы сур'ёзнай увазе з боку вэтработнікаў, было забракавана толькі 33 кані.

Кулакі з хутара «Камянецкі бор» без дазволу вэтдоктара забілі двох коняй. Сельсавет і райземчастка на гэтыя факты не рэагуюць.

Ёсьць рад фактаў, якія гавораць аб злачынна-барбарскіх адносінах да коняй з боку некаторых калгасьнікаў і нават з боку паасобных старшынь калгасаў.

Старшыня калгасу «Чырвоны сьцяг», Смародзінскага сельсавету, забіў двох коняй, якія вэтдоктарам прызнаны годнымі для работы.

Дырэкцыя саўгасу «Крупкі» вызначыла для выбракоўкі 14 коняй. Забракован - жа толькі адзін. Але дырэктар саўгасу праз загадчыка райза дабіўся, каб вэтдоктар прыехаў другі раз у саўгас і забракаваў патрэбную для дырэктара колькасьць коняй.

Ня лепш справа і з доглядам коняй па калгасах. У калгасе «Прач саха» безадказнасьць у доглядзе коняй давяла да таго, што коняй са стайняў выгналі, нібыта, на пашу. Больш тысячы коні галоднымі хадзілі па дварох. Такое самае становішча і па калгасах Халопеніцкага і Рыцкоўскага сельсаветаў. У калгас імя Калініна прыблудзілі 4 коні, якіх ніхто не прызнае.

Райкалгасаюз, ведаючы аб усіх гэтых фактах, ня прыняў ніякіх мер.

Сьледчыя органы павінны заразжа заняцца высьвятленьнем канкрэтных вінаватых у незаконным забойстве коняй і прыцягнуць да адказнасьці. Раённыя арганізацыі павінны павесьці шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў, бедняковў і серадняковў—аднаасобнікаў за падрыхтоўку каня да вясны.

С. Барысевіч.

Без страхі і прытулку

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.). Рад калгасаў Ўваравіцкага раёну сустрэлі зіму непадрыхтаванымі. У калгасе імя Леніна, Рудзіцкага сельсавету з 88 коняй большая частка стаіць пад адкрытым небам. Корм коням кладзецца на зямлю. Гаварыць аб ліквідацыі абязьлічкі на стайні тут ня прыходзіцца, бо стайні, як такавой, няма. А між тым, ёсьць поўная магчымасьць прыстасаваць хлявы калгасьнікаў для стайні. На жаль, аб гэтым ніхто ня думае.

Ня лепш адносяцца да коняй і ў калгасе «Перамога», дзе 26 коняй стаяць у ненакрытым хляве, без станкоў і драбін. У выніку расходуецца шмат кармоў, а коні галодныя. У калгасе імя Молатава, Ляпіцкага сельсавету, налічваецца каля 130 коняй і толькі 40 пастаўлены ў прыстасаваныя хлявы, якія яшчэ не ацеплены. Астатнія коні знаходзяцца ў бясспрытульным стане.

Праўленьне гэтага калгасу намецела да забракоўкі 26 коняй з тым разьлікам, што вясной 1932 году, калгас паводле пляну, павінен набыць трактар. Старшыня калгасу наогул лічыць, што «з каняём і без трактара будаваць калгасы няма ніякай магчымасьці». Кармы расходуюцца злачынна нерацыянальна, бяз усякага ўліку. Салома па падсьціл каровам скарыстоўваецца бяз усякіх норм.

У выніку адсутнасьці барацьбы з боку раённых арганізацый з барбарскімі адносінамі да коняй частка аднаасобнікаў, пад уплывам кулацкай агітацыі пачала распродваць годных для працы коняй. Гэтаму спрыяюць некаторыя загатоўчыя арганізацыі. Так, Гомельская кантора Белсадсаюзу накіравала ў мястэчка Ўваравічы сваіх закупшчыкаў, якія 4 сьнежня скарысталі кірмаш і без ведама і дазволу мясцовых арганізацый закупілі звыш 100 коняй. Сярод закупленых коняй шмат годных для працы.

Некаторыя калгасы таксама разбазарваюць годных для працы коняй. Калгас імя Сталіна (Сталінскі сельсавет), маючы 95 коняй, пастанавіў на сходзе 35 коняй прадаць.

Ігнараваньне конскай цягавай сілы ёсьць нішто іншае, як простая дапамога кулаку. Раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі павінны прыняць рашучыя меры да нармальнай зімоўкі коняй, дабіцца ліквідацыі абязьлічкі і ацяпленьня хлявоў, абвясьціўшы бязьлітасную барацьбу ўсялякім імкненьням кулацкіх агентаў вывесьці са строю працаздольных коняй.

Б. Харытончык.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

РАШУЧА ВЫКРЫВАЦЬ АПУРТУНІСТАЎ,

ЯКІЯ ПАТУРАЮЦЬ КУЛАЦКІМ СПАЖЫВЕЦКІМ ТЭНДЭНЦЫЯМ, НАКІРАВАНЫМ НА ЗРЫЎ ПЛЯНАЎ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

МАЦНЕЙ АГОНЬ ПА ПРЫМІРЭНЦАХ

БАЛЬШАВІЦКАЙ РАБОТАЙ забясьпечыць выкананьне пляну

Вялізарныя посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі стварылі абстаноўку, якая спрыяе выкананьню збожжазагатоўчых плянаў у найкарацейшыя тэрміны.

Між тым, рад вясковых партарганізацый не забясьпечылі яшчэ сваёй работай выкананьня гэтай важнейшай задачы. Тэмпы ходу загатовак яўна нездавальняючыя.

Адсутнасьць сыстэматычнай масавай работы сярод калгаспага і адпаасобнага бядняцка-серадняцкага сялянства, слабы націск на кулацка-заможныя гаспадаркі ў радзе месц, непыстарчальная барацьба з месьніцкімі, кулацкімі, спажывецкімі тэндэнцыямі ў частцы калгасаў—асноўныя прычыны маруднасьці тэмпаў ходу загатовак.

Тыя партарганізацыі, сельпарткомы і ячэйкі, якія па-бальшавіцку мабілізаваліся на правядзеньне збожжазагатовак, рашуча перамагаючы супраціўленьне кулака і яго агентуры — правых і «левых» апартуністаў, забясьпечылі перавыкананьне пляна.

У прыватнасьці рад калгасаў Бабруйшчыны («Чырвоная Брожка» і імя Будзённага, «Калініна», «Леніна», «Ідэя» і «Селішча») выканалі свае заданьні па збожжазагатоўках звыш чым на 100 проц. На адпаасобным сэктары плян загатовак у гэтым раёне выкананы на 124 проц.

Апартуністычным патураньнем кулаку, бязьдзейнасьцю ў справе арганізацыі загатовак найбольш адзначаюцца парт'ячэйкі, якія абслугоўваюць Багушэўскі і Берасьнеўскі сельсаветы.

Неабходна адзначыць аслабленьне ўвагі да задач барацьбы з апартуністычным скажэньнем дырэктыў партыі і ў паасобных ячэйках іншых раённых партарганізацый. Напрыклад, Пагасцкая парт'ячэйка (Старобінскі раён) ні ў якай меры не рэагавала на дэзарганізатарскую дзейнасьць апартуніста Ляўданскага. Пры пастаноўцы пытаньня аб Ляўданскім на справаздачна-перавыбарчым сходзе ячэйкі і пасяджэньні сельпарткому — сакратар РК Хіжнікаў займаў прымірэнчую пазыцыю.

Зусім зразумела, што прымірэнцтва да ўхілаў, «ліберальныя адносіны» да усякіх скажэньняў лініі партыі — ёсьць нішто іншае, як простае патураньне клясаваму ворагу. Задача парт арганізацыі — узмацніць барацьбу супроць апартуністаў і прымірэнцаў, якія падтрымліваюць рвацкія, кулацкія тэндэнцыі, накіраваныя на зрыў плянаў загатовак.

Да канчатковага тэрміну выкананьня плянаў збожжазагатовак заста ліся лічаныя дні. У гэтыя дні трэба дабіцца рашаючых задачу посьпехаў.

Зламаць кулацкі сабатаж

У часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі бюро ячэек тэмпы работы па выкананьні плянаў збожжазагатовак у Бабруйшчыне значна павысіліся. Многія парт'ячэйкі на-бальшавіцку разгарнулі работу сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага адпаасобнага сялянства па ажыцьцяўленьні пастановы жістандаўскага пленуму ЦК КП(б)Б аб загатоўках, рашуча выкрываючы варожыя пралетарскай дзяржаве месьніцкія тэндэнцыі, якія праўляліся ў некаторых калгасах.

Гэта работа дала станоўчыя вынікі. 39 калгасаў раёну поўнасьцю ўжо выканалі свае абавязкі перад дзяржавай па здачы (продажы) збожжа. Асабліва бліскучыя ўзоры ў гэтых адносінах паказалі калгасы «Чырвоная Брожка», выканаўшы свае заданьне на 240 проц., імя Будзённага № 1—на 210 проц. і калгасы імя Калініна, імя Леніна, «Ідэя» і «Селішча», якія выканалі пляны на 200 проц.

Саўгас «Жыляўічы» таксама выканаў плян збожжазагатовак з перавышэньнем.

Па адпаасобным сэктары заданьне выканана на 124,2 проц.

У вогуле-ж плян збожжазагатовак у раёне па становішчы на 10-га сьнежня выкананы толькі на 84 проц. Сярод адстаючых сельсаветаў вельмі выдзяляецца Багушэўскі і Берасьнеўскі, якія і напалову ня выканалі яшчэ сваіх заданьняў.

Увагу зварачае на сябе ступень выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі. Лічба выкананьня ганебная—толькі 44,1 проц. Такое зьявішча нельга інакш расцэньваць, як адсутнасьць з боку часткі парт'ячэек і сельсаветаў рашучага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі. Кулацкі сабатаж павінен быць зломлен.

Дні, якія засталіся да канчатковага тэрміну выкананьня плянаў загатовак, трэба ў максымальнай меры выкарыстаць для выпраўленьня адзначаных недахопаў. Для пасьпяховага выкананьня пляну загатовак ёсьць усе магчымасьці.

Магідаў.

У перадавых радох збожжазагатовак

Справаздачны пэрыяд работы Зэмбінскага сельпарткому (Барысаўскі р.) характарызуецца значнымі посьпехамі ў выкананьні асноўных задач калгаснага будаўніцтва.

У абслугоўваньні гэтага сельпарткому знаходзяцца 2 саўгасы і 25 калгасаў, большасьць якіх жывёлагадоўчыя. СПЕ дабіўся ўкамплектаваньня на 80 проц. КСТФ і на 75 проц. КМТФ. Жывёлагадоўчыя калгасы ўзялі на сябе абавязак ва што-б там ні стала закончыць камплектаваньне фэрм да новага году.

Многае зроблена ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. У 13-ці калгасах поўнасьцю ўведзена зьдзельшчына. Ёсьць дасягненьні ў ліквідацыі абязьлічкі. У рэзультаце гэтых мерапрыемстваў павялічыўся на 8 проц. удой кароў.

Справаздачна-перавыбарчую кампанію сельпартком увязаў з мабілізацыяй мас на выкананьне пляну загатовак. Дзякуючы шырока-разгорнутай работе ў гэтым напрамку **ПЛЯНЫ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК І МЯСАЗАГАТОВАК ВЫКАНАНЫ НА 100 ПРОЦ.** Рад калгасаў здаюць збожжа дзяржаве **звыш пляну.** Па выкананьні гэтых задач Зэмбінскі сельпартком зьяўляецца перадавым у Барысаўскім раёне.

Н.

СКАЖЭНЬНІ І ГАЛАВАЦЯПСТВА-- рэзультат адсутнасьці апэрацыйнага кіраўніцтва

Кіраўніцтва Сеньненскай раённай партарганізацыі практычна пачало рыхтавацца да справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў толькі тады, калі ў другіх арганізацыях ужо праводзіліся перавыбарчыя сходы. Толькі 10-га лістапада райком правёў нараду сакратароў парт'ячэек і ўпаўнаважаных райкому па пытаньні перавыбарчай кампаніі.

Пасьля гэтага па працягу ўсяго ходу перавыбарчай кампаніі, г. зн. да 1-га сьнежня райком ня ведаў, як праводзіцца гэта работа на мясцох за выключэньнем паасобных парт'ячэек, у якіх прысутнічалі на сходах кіруючыя работнікі РК. З вылучаных упаўнаважаных па перавыбарах многія абмежавалі сваю дзейнасьць толькі прысутнасьцю на справаздачна-перавыбарчых сходах, нічым не дапамогшы ячэйкам у разгортваньні падрыхтоўчай работы. Аказаліся і такія ўпаўнаважаныя, якія нават ні разу і не зазірнулі ў ячэйку (Грачоў).

З гэтай прычыны паасобныя ячэйкі ня здолелі забясьпечыць ажыцьцяўленьне асноўных задач, высунутых у дырэктыўным лісьце ЦК КП(б)Б. Вось прыклад. Расьнянская парт'ячэйка, абмеркаваўшы па сваім сходзе дырэктыўны ліст ЦК КП(б)Б аб перавыбарах, прыняла «лявацкага» зьместу пастанову: «Ліквідаваць самацёк у адносінах разгортваньня калгаснага руху па сельсавеце. Мабілізаваць партыйны, камсамольскі актыў і актыў сельсавету для рэгулярнай работы сярод беднаты і серадняку-аднаасобнікаў з тым, каб да трэцяй бальшавіцкай вясны (г. зн. да вясны 1932 г.) закончыць па сельсавеце суцэльную калектывізацыю». Аб асноўнай задачы калгаснага руху — арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў — гэта парт'ячэйка не сказала ні слова.

Не праявіла сваёй ролі ў правядзеньні гэтай важнейшай палітычнай кампаніі і раённая газэта «Камунар». Газэта абмежавалася зьмяшчаньнем дзьвёх невялічкіх заметак, прысьвечаных перавыбарам. Не папулярызован вопыт работы перадавых парт'ячэек у выкананьні асноўных задач партыі на вёсцы. ЯЧЭЙКА ПЕРШАЙ У РАЁНЕ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛА 100 ПРОЦ. ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК. Гэтага ячэйка дасягнула рашучай барацьбой з усякімі праяўленьнямі кулацкіх, спажывецкіх тэндэнцый у калгасах, бязьлітаснай барацьбой супроць кулака і яго агентуры ў радох партыі.

Паводле пляну райкому перавыбары ва ўсіх 20 парт'ячэйках павінны былі быць праведзены да 1-га сьнежня. Аднак, перавыбары да паказанага тэрміну праведзены толькі ў 8 ячэйках. У трох ячэйках яны сарваны, з прычыны пяноўнай яўкі партыйцаў і зусім нездавальняючай яўкі беспартыйных. У чатырох ячэйках, якія знаходзяцца ў раённым цэнтры, нават ня была разгорнута падрыхтоўчая работа да першага сьнежня. Аб перавыбарчым сходзе Відопскай ячэйкі частка партыйцаў нават і ня ведала. Калі прышоў сакратар адкрываць сход і, сустрэўшыся з фактам адсутнасьці многіх членаў ячэйкі і поўнай адсутнасьці беспартыйных, парашыў склікаць сход пры дапамозе... пажарнага звону.

Ня дзіва, што пры такім становішчы, пры адсутнасьці масавай работы ў сувязі з правядзеньнем перавыбарчай кампаніі, многія парт'ячэйкі ня здолелі забясьпечыць пэўнага пералому ў выкананьні пляну збожжазагатовак.

Усе гэтыя факты былі выкрыты па партнарадзе, якая адбылася 1 сьнежня. На гэтай нарадзе райком завастрыў увагу на недахопах, выкрытых за час правядзеньня перавыбарчай кампаніі і працягнуў тэрмін перавыбараў да 10-га сьнежня.

Барыс Зэльцэр.

Бяспрынцыпнае прымірэнцтва

Для ўзмацненьня масавай работы сярод калгасьнікаў, бедняко ў і серадняко ў—аднаасобнікаў па выкананьні пляну збожжазагатовак Пагосцкая парт'ячэйка (Старобінскі раён) прымацавала партыйцаў да найбольш адстаючых калгасаў і вёсак. Праверкай-жа выкананьня камуністамі даручаных абавязкаў ячэйка не займалася.

Выявілася, што некаторыя ўпаўнаважаныя ня толькі бязьдзейнічалі, а проста прапагандавалі ў масах свае права-апартуністычныя погляды аб «перэальнасьці» пляну. Асабліва гэтым выдзеліўся апартуніст Ляўданскі, які быў прымацован да вёскі Залесьсе. У выніку «работы» гэтага апартуніста вёска выканала плянавае заданьня толькі на 15 проц., а па ўсім сельсавеце яшчэ не дасягнута выкананьне і да 50 проц.

Парт'ячэйка прымірэнча адносілася да посьбіта кулацкай ідэалёгіі. Апартуністычная «лінія» Ляўданскага была выкрыта толькі на справаздачна-перавыбарчым сходзе ячэйкі, але замест таго, каб на гэтым канкрэтным факце мабілізаваць ячэйку на бязьлітасную барацьбу супроць апартунізму, пытань не аб паводзінах Ляўданскага было змазана. **У абарону апартуніста Ляўданскага выступіў сам сакратар РК КП(б)Б Хіжнікаў.**

Сельпартком ўсё-ж такі паставіў пытаньне на сваім пасяджэньне аб Ляўданскім, які і на гэтым па сяджэньні пад абаронай Хіжнікава ўпарта падтрымліваў свае погляды. Ен заявіў: «Я прызнаю сябе вінаватым толькі тады, калі вы дасьцё гарантыю аб тым, што плян загатовак у вёсцы Залесьсе вы выканаеце».

За падрыўную работу ў збожжазагатоўках, за ўпартую абарону апартуністычных поглядаў сельпартком абвясьціў Ляўданскаму суровую вымову. Нарэшце, Хіжнікаў згадзіўся, што паводзіны Ляўданскага яўна апартуністычныя, але ўсё-ж такі Хіжнікаў ня раіць сурова падыходзіць і ўносіць прапанову зьмяжчыць партспагнаньне Ляўданскаму. Чым гэта кваліфікаваць, як не прымірэнцтвам, не гнілым лібералізмам у барацьбе з апартуністамі?

Борар.

АГЛЯД ДРУКУ

Сон на баявым пасту

(„Палеская праўда" Гомель)

У гісторыю барацьбы за сацыялізм упісаны новыя слаўныя старонкі. Алізія за адным уступаюць у строй гіганты сацыялістычнай індустрыі з калёны «518».

Ужо пачаюць першыя домны Магнітабуду. З канвэера СТЗ ужо выйшлі тысячы трактараў, нашых савецкіх трактараў ад матора да апошняга мэханізму. Маскоўскі аўтагігант ужо даў краіне сотні машын. На чарзе — пуск Нізжагарадзкага аўтамабільнага заводу.

Уся краіна з нябывалым уздымам, з бязьмернай энэргіяй змагаецца за своечасовы пуск «518». Задача заключаецца ў тым, каб няўхільна ўзмацняць тэмп будаўніцтва, дасканала аўладаць тэхнікай мантажу, рэалізаваць на ўсіх новабудоўлях 6 умоў перамогі — 6 указаньняў тав. Сталіна.

На гэтым рашаючым фронце пяцігодкі роля друку — асабліва адказная. Друк павінен быць сапраўдным арганізатарам мас на барацьбу за своечасовы пуск усіх новабудоўляў. Тут патрэбна асабліва ўпартая работа, канкрэтная апэрацыйная работа, работа, насычаная глыбокім зьместам і веданьнем справы.

***

У Гомелі будуецца ўсесаюзны гігант харчовай індустрыі — МАРГАРЫНАВЫ ЗАВОД. Ён будзе пры трохзьменнай рабоце даваць 10 тон прадукцыі за адну зьмену.

Значэньне гэтага будаўніцтва цяпер, калі мы рашуча фарсуем разьвіцьцё харчовай прамысловасьці, — зусім відавочна.

1 сьнежня мінуў апошні тэрмін пуску заводу. Аднак, будаўніцтва і да гэтага часу яшчэ ня скончана. На будаўніцтве ня былі ўзяты сапраўды бальшавіцкія тэмпы. Трыкутнік будоўлі ня здолеў стаць на чале энтузіязму рабочых - будаўнікоў. Ня меншая адказнасьць клавецца і на рэдакцыю «ПАЛЕСКАЙ ПРАЎДЫ».

Кастрычнік і лістапад вырашалі посьпех будаўніцтва. «П. П.» гэтага ня ўлічыла. У першай декадзе кастрычніка «П. П.» наогул маўчала. Прычыны маўчаньня газэты—невядомы. Нельга, аднак, меркаваць, што ў гэтыя дні на будоўлі ўсё было добра. Далёка, не. Сама-ж газэта неўзабаве пачала біць трывогу:

«Белдзяржбуд зрывае тэрміны скончэньня будаўніцтва. Яшчэ і дагэтуль ня скончаны фундаменты пад варштаты, кацельны цэх, будаўніцтва складаў і шмат іншага...

Абсталяваньнем завод забясьпечан невыстарчальна. Абсталяваньне затрымліваецца мясцовымі заводамі...

«Сярод рабочых НЕ ПРАПРАЦАВАНА прамова тав. Сталіна, ня ўведзена прэміяльна-прапрэсыўная зьдзельшчына» (№ 243, 13 кастрычніка).

І так, на будоўлі—вялікія перабоі. Адсюль «Палеская Праўда» робіць толькі адзін асноўны вывад:

«Адпаведныя арганізацыі павінны пакапаціцца аб своечасовым снабжэньні будаўніцтва неабходнымі матар'яламі».

Усе іншыя вывады пабудаваны ў тоне дакладрацыйных заклікаў і самых агульных абяцаньняў:

«...мы будзем рашуча змагацца за бальшавіцкія тэмпы будаўніцтва. Мы выканаем загад нашага ўраду...»

Нама слоў, ударнае снабжэньне будоўлі ўсімі патрэбнымі матар'ялямі і абсталяваньнем — адзін з самых сур'ёзных фактараў своечасовага пуску заводу. Але справа ня толькі ў гэтым. Зарука канчатковай перамогі — у бальшавіцкай рэалізацыі 6 указаньняў тав. Сталіна.

Для «П. П.» гэта пытаньне відаць ня мела істотнага значэньня. Прычынамі гэта ўлічыла магчымыя абмежаванасьці галай фіксацыяй: — на будаўніцтве прамова т. Сталіна яшчэ нават не прапрацавана. А адзінка такога ганебнага факту, а вывады і задачы, якія адсюль выцякаюць? Іх — у газэце НЯМА...

Праз некалькі дзён «Палеская Праўда» зноў забіла трывогу. На гэты раз выступленьне газэт пачынаецца з, так сказаць, інфармацыйнага паведамленьня:

«10 кастрычніка на будоўлі маргарынавага заводу кіраўніцтвам была праведзена выніковая работа па выяўленьні ходу будаўніцтва... Рэзультаты наступныя: выкананьне работ складае: па такелажных — 30 проц., па будаўніцтве фундаментаў — 75, каналізацыі — 10...» (№ 246, 17 кастрычніка).

Няма чаго казарыць, «добрая» апэрацыйнасьць — спакойна рэгістраваць факты са спазьненьнем на цэлы тыдзень! Дае-ж прычыны такіх агідных тэмпаў будаўніцтва? Рэдакцыя, як і раней шукае іх ВЫКЛЮЧНА ў адным замкнутым: няма многіх праектаў, няма матар'ялаў. Корань зла «П. П.» бачыць у тым, што:

«Снабжэньне будаўніцтва часткамі і дэталямі для трубапроводу, каналізацыі, пажарнага абсталяваньня і іншых работ праводзіцца нездавальняюча» (№ 248, 19 кастрычніка).

Тон газэты мімаволі прымушае насторажыцца. Стаўка «П. П.» на «аб'ектыўныя» прычыны так і б'е ў вочы. Перабоі ў снабжэньні, бясспрэчна, адмоўна адбіліся на будаўніцтве. Але хіба ня было іншых прычын? Хіба толькі З АДНЫМІ гэтымі перабоямі трэба змагацца? «П. П.», аднак, іншых прычын не знаходзіць. Яна толькі паміж радкоў канстатуе, што па будаўніцтве:

«...ёсьць рад простых парушэньняў кадагавору».

Далейшыя матар'ялы аб будаўніцтве радакцыя зьмяшчала з даволі працяжнымі перарывамі. Настрой «П. П.» пры гэтым мяняўся, як барометр перад шторамам. Самы бязьмежны аптымізм раптоўна ўступаў месца глыбока пасымістычнаму, хаця і пнейнаму расчараваньню.

26 кастрычніка газэта піша:

«Праз 36 дзён маргарынавы завод будзе пушчан. Мантаж абсталяваньня маргарынавага заводу хаця і са спазьненьнем (!) будзе з посьпехам скончан».

28 кастрычніка, аднак, тон чарговай падборкі «П. П.» рэзка зьмяняецца. На будаўніцтве, аказваецца, «магчыма — пагроза прарыву»:

«...мантажныя работы на заводзе нават не разгарнуты да патрэбных разьмераў, а гэта можа быць толькі пры наяўнасьці ўсяго абсталяваньня (знаёмы ківок у бок «аб'ектыўных» прычын).

Далей пасьледавала працяжнае маўчаньне, парушанае трывожным сыгналам:

«— Белдзяржбуд ня здаў ні аднаго аб'екту пад мантаж. Устаноўка мантажу ідзе марудна. Мантаж выкананы на 30 проц.» (№ 226, 12 лістапада).

Сапраўды, на адным тыдні сем пятніц. І ў цытаваных выступленьнях «П. П.», між іншым, галоўны ўпор робіць толькі на адсутнасьць праектаў і абсталяваньня. Ну, а як-жа на будаўніцтва з рэалізацыяй 6 умоў тав. Сталіна, з пераводам рабочых на прэміяльна-прапрэсыўную зьдзельшчыну, з перабудовай партыйнай і прафсаюзнай работы? Маўчаньне.

На пароге сьнежня «П. П.» спакойна канстатуе наближэньне ганебнага зрыву.

28 лістапада — пралёг:

«— Своячасовы пуск маргарынавага заводу зрываецца» (№ 279).

2 сьнежня — фінальнае заключэньне:

«— Своячасовы пуск маргарынавага заводу сарваны» (№ 282).

І толькі зараз, калі зрыў пуску заводу стаў фактам, у «П. П.» расхрыліся вочы. Толькі зараз яна прабуе загаварыць на ўвесь голас. Толькі цяпер яна ўбачыла, што справа ні ў адных праектах і матар'ялах, што кіраўніцтва будоўлі за панічнымі спробамі аб адсутнасьці абсталяваньня хавала свой сабатаж тэмпаў:

«...грамадзкія арганізацыі на будаўніцтве слаба праводзілі работу па разгортваньні сацпаборніцтва і ўдарніцтва. Да гэтага часу няма практычных мерапрыемстваў з боку як партыйных, так і прафсаюзных арганізацый па рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна. Ніхто не займаўся афармленьнем ударніцтва. Новы заўком яшчэ ня ўзяўся па-бальшавіцку за работу» (№ 282).

«Будаўніцтва праходзіць марудным тэмпамі і зусім бясплянова... Да гэтага часу толькі 10 проц. рабочых пераведзены на зьдзельшчыну, ды і то часова... Сацыяльна-бытавое абслугоўваньне рабочых на будаўніцтве дрэннае» (№ 284).

Не папякалавала «П. П.» і апартуністычны трыкутнік будаўніцтва. Яна ўзяла ад суровы абстрал яго калегіяльнасьці спасылальні на адсутнасьць праектаў і матар'ялаў:

«Дзе-ж быў трыкутнік маргарынавага заводу раней (гэта пытаньне «П. П.» ня шкодзіла-б адпесьці і па свой рахунак). **Чаму ён ня прыняў такіх мер, якія-б сапраўды забясьпечылі своечасовае атрыманьне неабходнага абсталяваньня. Чаму ён толькі зараз узьняў свой голас. Ці не зьяўляецца гэта самастрахоўкай для апраўданьня сваёй бязьдзейнасьці» (№ 279).**

Сваіх памылак «Палеская праўда» НЕ ЗРАЗУМЕЛА і НЯ ЎЛІЧЫЛА. Яна па-ранейшаму не адмовілася ад ролі спакойнага рэгістратара. Апошні артыкул «П. П.», які мы прагледзелі («П. П.» ад 4 сьнежня) — яркае пацьвярджэньне. Артыкул выкрывае прычыны зрыву пуску заводу і толькі. «П. П.» ні адным словам НЕ МАБІЛІЗУЕ мас на барацьбу за неадкладнае скончэньне будаўніцтва, за рэалізацыю на пабудове 6 умоў тав. Сталіна. Нічога падобнага. Адзіны вывад газэты:

«У справы будаўніцтва маргарынавага заводу павінны ўнікнуць аўтарытэтныя арганізацыі. Нельга так адносіцца да будаўніцтва такога важнага заводу» (№ 284).

***

«Палеская праўда» пад кіраўніцтвам партарганізацыі павінна выправіць свае памылкі і мабілізаваць масы будаўнікоў на барацьбу за найхутчэйшы пуск гомельскага гігانта харчовай індустрыі

Е. Б. ПАШУКАНІС

Аўладаць марксыцка-ленінскай тэорыяй*)

Вялізарнае значэньне ў сэнсе далейшага разьвіцьця марксыцка-ленінскай навукі, у пытаньнях распрацоўкі гісторыі бальшавізму адыгрывае ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісі «Пролетарская революция». Гэты ліст адрасаваны гістарычнаму фронту, але ён датычыць ня толькі гісторыкаў-марксыстаў, як гэта ўжо прабавалі даводзіць некаторыя таварышы. Пытаньні, узьнятыя тав. Сталіным адносяцца ў першую чаргу, вядома, да гісторыкаў, але разам з гэтым і да ўсёй навукова-даследчай работы ў галіне распрацоўкі марксыцка-ленінскай тэорыі.

Ліст тав. Сталіна дае зусім выразную палітычную ўстаноўку і напрамак для бальшавіцкага вывучэньня гісторыі партыі, б е на гнілым лібералізьме ў адносінах да клясавага ворага, на прымірэньцтве да варожых выказваньняў па тэарытычным фронце. Гэты гістарычны дакумэнт правадыра партыі з усёй выразнасьцю ўказвае на палітычную небясьпеку трацкісцкіх вылазак, якія аблягчаюцца тым, што рад таварышоў да апошняга часу разглядалі трацкізм не як перадавы атрад контр-рэвалюцыйнай буржуазіі, а як фракцыю ў асяродзішчы камуністаў, што настойвае яшчэ па сваіх памылках.

Якраз супроць гэтага рашуча накіравана выступленьне т. Сталіна. Укрытыя факты і настроі пры абгаварэньні ўзьнятых т. Сталіным пытаньняў паказваюць, наколькі выступленьне правадыра партыі зьяўляецца своячасовым, узорам глыбокага веданьня марксызму-ленінізму і дыялектычнага яго прыстасаваньня да канкрэтнай абстаноўкі.

У цэлым радзе нашых навукова-даследчых устаноў, рэдакцый марк-сыцкіх часопісяў давалі месца для дыскусій па тых пытаньнях, якія зьяўляюцца для бальшавікоў аксіёмай. Дыскусаваць па зусім ясных для бальшавікоў пытаньнях — гэта значыць рабіць глыбокія палітычныя памылкі, аддягваць увагу партыі ад задач сацыялістычнага будаўніцтва, не разумець тых задач, якія стаяць перад тэарытычным фронтам.

Падобныя памылкі прыкрываліся такімі разважаньнямі: «Гэта, бачыце, ня наша спэцыяльнасьць, таму мы ня ўмешваемся ў гэту справу. Спэцыяліст выказваецца па спэцыяльным пытаньні і яго выказваньне зьмяшчаем у парадку абгаварэньня».

Такая ўстаноўка нікуды ня варта. Ленінізм — ня вузкая спэцыяльнасьць. Абарона пазыцый ленінізму, абарона бальшавіцкай гісторыі нашай партыі ад апартуністычных і трацкісцкіх скажэньняў — просты абавязак кожнага бальшавіка.

Устаноўка — «спэцыяльныя пытаньні трэба ставіць на абмеркаваньне» прывяла да таго, што ўчарайшыя трацкісты і паўтрацкісты, людзі, якія па-трацкісцку мысьляць, атрымалі магчымасьць беспакарана працягваць свае канцэрцы, выкарыстоўваць трыбуну нашага камуністычнага друку для прапаганды контр-рэвалюцыйных ідэй.

Выступленьне тав. Сталіна абавязвае ўвесь ідэалёгічны фронт паносіць на вылазках ворага руйнуючы ўдар ня толькі тэарытычнага, але і палітычнага характару, бо тут справа ідзе аб кроўных інтарэсах бальшавізму.

Гэтыя гора-тэарэтыкі і навуковыя работнікі спрачаліся па «спэцыяльных пытаньнях» і не заўважылі, што з выступленьняў людзей, далёкіх бальшавізму, склаталася цэлы трацкісцкі ланцужок, антыленінская канцэпцыя.

Усе іх выказваньні і палажэньні ўкладаюцца ў адну лінію: бальшавізм да 1917 году гэта, моў, «тэорыя сялянскай рэвалюцыі», тэорыя «барацьбы за амэрыканскія шляхі разьвіцьця гаспадаркі». І адсюль ужо само сабою выцякала, што бальшавізм да 1917 году ніякага міжнароднага значэньня ня меў. Атрымлівалася, што галоўнае ў ленінізьме — не праблема дыктатуры пралетарыяту, а сялянскае пытаньне — тое самае, што калісьці так настойліва прапагандаваў т. Зіноўеў. Нашы гісторыкі (ды і ня толькі яны) праходзілі міма сталінскага азначэньня ленінізму аб тым, што галоўнае ў ленінізьме — не праблема дыктатуры пралетарыяту.

Усё гэта вяло да адмаўленьня бальшавізму ў рэвалюцыі 1905 году. «Тэарэтыкі» з апартуністычнага і трацкісцкага лягеру даводзяць, што калі галоўнае ў бальшавізьме — праблема дыктатуры пралетарыяту, то значыцца, у 1905 годзе ніякага бальшавізму яшчэ ня было, бо тады стаяла пытаньне аб буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Яны хочуць даказаць, што бальшавізм наогул узьнік толькі ў 1917 годзе.

Куды цягнуць такія ўстаноўкі? Яны цягнуць да славутай трацкісцкай хлусьні аб перауздзеньні бальшавізму. Усе Маеўскія, Слуцкія, Валасевічы, Кіны — гэта адзін ланцужок. Яны настойваюць на тым, што бальшавіцкая партыя не рыхтавала пралетарыят да барацьбы за сацыялізм, што Ленін не рыхтаваў партыю да рашучых баёў за пралетарскую рэвалюцыю. Гэтыя кантрабандысты і фальсыфікатары жалюць справу так, што партыя ў 1917 годзе ня ведала куды ёй ісьці, заблыталася, як аб гэтым піша адзін з вядомых у БССР гісторыкаў т. Югаў.

Такога характару ўстаноўкі ўпіваюцца ў сур'ёзныя пытаньні міжнароднага камуністычнага руху. Калі ўявіць ленінізм, бальшавізм да 1917 году, як тэорыю, прыстасаваную да ўмоў адсталай сялянскай краіны, калі сказаць, што Ленін, як гэта лічыць Слуцкі, не змагаўся за сацыялізм, ня вёў бязьлітаснай барацьбы супроць Каўцкага, дык выходзіць, што больш пасьлядоўнымі і больш «левымі» былі Роза Люксэмбург і т. Зван. нямецкія левыя сацыял-дэмакраты. Гэта вядзе да змазваньня памылак. Люксэмбургіянства і нямецкіх левых, да змазваньня меншавіцкіх памылак Розы Люксэмбург. Усе гэта робіцца для таго, каб узьняць барацьбу супроць бальшавізацыі нашых брацкіх кампартый, для таго, каб паставіць пад сумненьне вядучую ролю УсеКП(б) у Камінтэрне.

На фракцыі таварыства гісторыкаў-марксыстаў выступаў тав. Радэк. Ён, паказаўшы на асобныя памылкі Люксэмбургіянства, прызнаўшы свае некаторыя памылкі, разгарнуў даволі цікавую «тэорыю» раўчакоў і плыняй, з якіх складаецца міжнародны камуністычны рух. Радэк заклікаў не забывацца аб гэтых раўчаках, ня зьнішчаць іх. Ен падкрэсьліваў, што Роза Люксэмбург зьяўляецца мостам, па якім многія нямецкія рабочыя прыдуць да камунізму.

Што гэта такое? Гэта зноў-такі спроба апраўдаць памылкі Розы Люксэмбург, спроба ператварыць маналітны Камуністычны Інтэрнацыянал, бальшавіцкі Інтэрнацыянал у нейкі конгламерат розных раўчакоў і плыняй.

Падобныя скажэньні мы маем ня толькі ў пытаньнях гісторыі партыі. Яны ёсьць таксама і ў пытаньнях тэорыі дзяржавы і дыктатуры пралетарыяту. Адно з другім тут, вядома, цесна зьвязана.

Знаходзяцца такія «тэарэтыкі», якія ў сваіх кнігах і падручніках пішуць, што вось толькі ў часе пралетарскай рэвалюцыі Ленін разгарнуў сваё вучэньне аб дзяржаве. Пры гэтым забываецца ўся папярэдняя гісторыя бальшавізму, адкідаецца барацьба Леніна супроць Струвэ, забываюцца ўстаноўкі Леніна аб рэвалюцыйна-дэмакратычнай дыктатуры пралетарыяту і сялянства. Замоўчваецца непрымірымая барацьба Леніна супроць меншавізму. Адкідаюцца ленінскія ўказаньні, што тыя пытаньні, якімі мы займаліся адразу-ж пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі, практычна пасталі ўжо ў 1905 годзе. Гэта ўсё забываецца, замоўчваецца.

І наадварот, высоўваецца прэтэнзія, напрыклад, з боку Бухарына, што ён са сваёй бязглуздай анархічнай тэорыяй «выбуху дзяржавы» выступіў супроць Каўцкага раней чым Ленін, вастрэй чым Ленін і правільней чым Ленін.

Тав. Сталін у сваім выступленьні на красавіцкім пленуме ЦК УсеКП(б) 1929 году даў зьніштажальную крытыку падобным прэтэнзіям Бухарына і бухарынскім вучням. Адзін з бухарынскіх вучняў — Стэн на гэтым пленуме проста заявіў, што «Бухарын раней і зусім правільна прышоў да пытаньня аб адносінах пралетарскай рэвалюцыі да буржуазнай дзяржавы».

І ўсё-ж, пасьля таго, як т. Сталін выступіў з рэзкай крытыкай прэтэнзій Бухарына, у 1931 годзе выходзіць 4-ая кніга ленінскага шасьцітомніка, таго выданьня, якое павінна несьці ленінізм у шырокія масы працоўных, у камэнтарыях да работы Леніна «Дзяржава і рэвалюцыя» — ні слова не гаворыцца пра ўсе папярэднія работы Леніна, пра барацьбу супроць апартуністычных скажэньняў тэорыі аб дзяржаве, якую вёў Ленін яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі. А памылкі Бухарына выкладаюцца такім чынам, што іх быццам бы зусім і ня было.

Таму ня толькі ў галіне тэорыі, але і ў галіне вучэньня аб дзяржаве мы павінны весьці жорсткую барацьбу супроць кантрабанднага працягваньня апартуністычных і трацкісцкіх ідэй.

На нацыянальным пытаньні зараз вядзецца дыскусія. Але-ж якая тут можа быць дыскусія? Ці можам мы дыскусаваць аб тым, што адмаўленьне права нацый на самавызначэньне — характэрнае для польскіх сацыял-дэмакратаў і Розы Люксэмбург, для пазыцый Пятакова і Бухарына — было сапраўдным меншавізмам, толькі прыкрытым «левай» фразай. Ці можам мы зараз дыскусаваць аб тым — правільна, ці няправільна рабілі бальшавікі, калі яны высунулі і абараняюць лёзунг самавызначэньня народаў аж да адлучэньня.

Па гэтых пытаньнях мы ня маем ніякага права адкрываць дыскусіі. Замест дыскусій мы павінны тут даць рашучы руйнуючы адпор усякім праяўленьням ухілаў у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, у бок розных мясцовых шавінізмаў.

Антыленінскія вылазкі маюць зараз ня толькі замаскаваныя формы, ня толькі прыкрываюцца аўтарытэтам Розы Люксэмбург. Мы зараз сустракаемся з простымі выпадкамі, калі падзёрты і брудны сьцяг трацкізму асобныя гора-тэарэтыкі спрабуюць адкрыта выцягнуць на сьвет.

У восьмы нумар часопісі Інстытуту Савецкага Будаўніцтва быў здан артыкул Шостака, які зараз выкрыт, як валяўнічы трацкіст. У гэтым артыкуле справа выглядала так, што партыя зусім ня кіруе работай саветаў, абыходзіць саветы.

Гэта — няпрыкрытая трацкісцкая ўстаноўка, брудная сапронаўская хлусьня, што нібы партыя вядзе работу праз галаву саветаў.

У тым, што гэта нічым ня прыкрытая хлусьня — зусім лёгка пераканацца на фактах. Даволі ўказаць на пастанову 14-й партыйнай канфэрэнцыі аб ажыўленьні саветаў, па рэзалюцыі XVI партканфэрэнцыі па барацьбе з бюракратызмам, на сьнежаньскі пленум 1930 году, які зьвярнуў вялікую ўвагу партыі па перабудову работы саветаў, на аслабаненьне Рыка ва і пазначэньне аднаго з лепшых бальшавікоў-ленінцаў аднаго з прэвадыроў нашай партыі тав. Молатава на пост старшыні СНК СССР. Гэтыя факты ўпчэпт разьбіваюць ус

Усесаюзны рэйд-паход за рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна

У выніку недаацэнкі ўказаньняў правадыра

ПАНЧОШНЫ КАМБІНАТ ІМЯ „КІМ“ ПРАЦУЕ ПА-СТАРОМУ

Ударнікі друку абяцаюць сваю дапамогу ў перабудове работы

Ударнікі «Праўды», «Зьвязды» і «Віцебскага пралетара» правялі масавы чатырохдзённы рэйд на праверцы рэалізацыі 6-ці ўмоў тав. Сталіна на панчошна - трыкатажным камбінаце імя КІМ. Перад рэйдам брыгады разам з фабрычнымі арганізацыямі шырока растлумачылі ў цэхах значэньне поўнага ажыцьцяўленьня ўказаньняў тав. Сталіна для работы фабрыкі. Вялікая зацікаўленасьць і актыўны ўдзел у рэйдзе ня 163 рабочых — было адказам на заклік фабрычных арганізацый.

У часе рэйду выяўлена шмат недахопаў, якія гавораць аб тым, што на фабрыцы да апошніх дзён існавала поўная недаацэнка ўсіх тых мерапрыемстваў, што проста выцякаюць з прамовы тав. Сталіна.

Панчошная фабрыка адчувае вялікі недахват у рабочай сіле — на сёньняшні дзень каля 400 чалавек. У чэрвеньскім квартале фабрыцы патрэбна будзе каля 1.000 новых рабочых. Між тым, кіраўнікі фабрыкі, ня давочна, спадзяюцца на самацёк рабочай сілы, бо да гэтага часу ня включаны толькі адзін дагавор з калгасам імя Сталіна на 75 рабочых.

Недахват рабочай сілы ўскладае на кіраўніцтва фабрыкі большую адказнасьць за механізацыю. Аднак, рад фактаў сьведчыць аб поўным ігнараваньні і гэтага пытаньня. У сартовачным цэху можна з'эканомініць рабочую сілу, арабіўшы спэцыяльныя тачкі для адвозу гатовых вырабаў. У механічным цэху сьлясарная работа праводзіцца сапатужным спосабам. Няма такіх элемэнтарных варштатаў, як такарны, фрэзэрны, сьвідравальны і інш. У сувязі з гэтым зацягваецца мантаж абсталяваньня, а таксама падрыхтоўка запасных частак для машын і варштатаў.

Ня глядзячы на недахват рабочых, не вядзецца барацьбы з цякучасьцю. У жніўні прынята на работу 193 рабочых, звольнілася — 46 чал., у верасьні прыбыло—345, пакінула фабрыку—44, у кастрычніку прыбыло—323, звольнілася — 66, у лістападзе прынята—310, звольнілася — 46. Гэтыя лічбы гавораць аб наяўнасьці сур'ёзнейшых недахопаў у абслугоўваньні рабочых, сыстэме зарплаты, арганізацыі працы.

Сапраўды, у сыстэме зарплаты ёсьць усе хібы, на якія ўказаў тав. Сталін у сваёй прамове. Сыстэма зарплаты па фабрыцы імя КІМ мэханічна перанесена са старой фабрыкі імя Клары Цэткін. Нормы і расцэнкі ўстаноўлены «на вока». ТНБ яшчэ няма. «Лявацкай» ўраўніловкі на фабрыцы ў пашыне. Вось рад фактаў. У вярэтэнна-фарбовачным цэху вятучай прафесыяй зьяўляюцца сартоўшчыкі. Ім вызначан 6 разрад, а менш кваліфікаваны і адказны працэс работы — фармоўка—аднесен да 7 разрату. Заработак больш кваліфікаваных рабочых швейна-кіцельнага цэху — катлёўшчыц —складае 70 руб., а менш кваліфікаваных — сьвідравальшчыц — 100 рублёў.

Бытавыя ўмовы таксама патрабуюць лепшага. Інтэрнат не запавальняе патрэб рабочых. У інтэрнаце брудна, зімнія рамы ня ўстаўлены, печы не апальваюцца, вады няма, ложкі паламаны, мэдычнага нагляду няма і г. д. Частка кваліфікаванай рабочай сілы пакінула фабрыку з-за кепскіх жыльлёвых умоў.

Ахова працы ў запазе. Рабочыя фарбовачнага цэху прымушаны мыцца ў брудным вадзе, бо адміністрацыя не сьпяшаецца закончыць пабудову душа. Вэнтыляцыя няспраўна. Чамусьці шкадуюць мыла, хоць яно ёсьць на складзе ў выстарчальнай колькасьці. У сьлесарна - кавальскім цэху няма ўмывальнікаў і ручнікоў. У мэханічным і вязальным цэхах шаравое асьлепленьне ня спраўнае і рабочыя працуюць у холадзе. Зімовай спэцвопраткі рабочыя не атрымалі.

Сталоўка яшчэ не стала цэхам харчаваньня. Чаргі вялікія. Увесь абедзённы перапынак рабочыя трацяць на чаканьне абеду. Трэцяя зьмена

Лепшы ўдарнік заводу «Камунар» тав. ЦЭРЭШКА.

пазбаўлена гарачых абедаў. Буфэт кульгае па абедзьве нагі, у ім няма нават тых прадуктаў, якія ёсьць у выстарчальнай колькасьці ў ЗРК.

Між іншым, гародніна, якую сталоўка загатовіла на зіму, псуецца. Два вагоны бульбы, схаваныя ў склепе, гніюць. Сьвінарнік не ацеплен. Замест 85 сьвіней у ім толькі 26. Вялікія чаргі наглядаюцца і ў крамах ЗРК. А на тэрыторыі фабрыкі, якая знаходзіцца ў трох кілёмэтрах ад гораду, няма ні адной крамы.

Арганізацыю працы характарызуе поўная абязьлічка. Паміж работнікамі цэхаў і аддзелаў няма выразнага разьмеркаваньня функцый. Тое саме паміж загатоўкам гаспаларкі і камэнцантам фабрыкі. Кацельная, транспартная і інш. вытворчыя адзінкі знаходзяцца без кіраўніцтва. У цэхах работніцы часта перажідваюцца з месца на месца. У вязальным цэху рэгуліроўшчыцы не прымацаваны да паасобных вучасткаў работы.

Абязьлічка прыводзіць да адсутнасьці ўвязкі паміж цэхамі. З прычыны несвачасовай падачы матальным цэхам нітак, у вязальным—вялікія прастоі. 6-га сьнежня па віне матальнага цэху, вязальны цэх прастаяў 1 гадз. 15 мін.

Пытаньне аб якасьці прадукцыі не завострана. Брак у кастрычніку перавысіў максымум на 10 проц., у лістападзе—на 15 проц.

Паломка іголак дасягае ў зьмену 350-400 шт. У вязальным цэху з-за няправільнай устаноўкі паламаны 90 тавараадводаў. Хто пясе адказнасьць за гэта—невядома.

Мэханізмы і абсталяваньне скарыстоўваюцца ня поўнасьцю. У швейна-кіцельным цэху бязьдзейнічаюць 12 машын, а на 3-й зьмене—усе 99. У вязальным цэху з 212 аўтаматаў, працуюць толькі 159. У фарбовачна-апрытурным цэху штодзённа не скары стоўваюцца 30 параформаў.

Фабрыка не забясьпечана інжынэрна - тэхнічным пэрсаналам. З 24 ІТР толькі адзін мае спэцыяльную падрыхтоўку. У той-жа час інжынэр тав. Коган — спэцыяліст па трыкатажу—працуе тэхнічным кіраўніком вязальнага цэху, а на пасадзе памочніка тэхнічнага кіраўніка, які павінен побра вець усю трыкатажную справу, знаходзіцца тэхнік—электра-мэханік.

Аб аўладаньні тэхнікай яшчэ толькі гавораць. Тэхнічных гурткоў няма. Курсы рэгуліроўшчыкаў працуюць з перабоямі, бо яны не прыстасаваны да зьмен і не забясьпечаны тэхнічным кіраўніцтвам.

Адміністрацыя фабрыкі не забясьпечыла ІТР кватэрамі. Тэхнік тав. Маруда жыве на кухні аднаго з інтэрнатаў фабрыкі.

Некаторыя ІТР жывуць у горадзе і шмат часу трацяць на хаду. Да гэтага часу ня вырашана пытаньне аб забесьпячэньні ІТР прадуктамі і прамтаварамі.

Паасобныя факты гавораць аб паляпшэньні ўраўнілаўкі ў зарплаце інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу. Напрыклад, тэхнік Якаўлеў пры пераводзе яго на пасаду памочніка тэхнічнага кіраўніка, атрымлівае 210 руб., у той час, як майстар швейна-кіцельнага цэху атрымлівае 400 руб. Інжынэр — тэхнічны кіраўнік вязальнага цэху Коган атрымлівае 225 руб., а мэханіку гэтага-ж цэху ўстаноўлена пэнсія ў 350 руб. Загадчык аддзелу эксплёатацыі тэхнік - электрык атрымлівае 190 руб., а падпарадкаваны яму мацёр атрымлівае 225 руб.

Гаспадарчы разрахунак на фабрыцы фактычна яшчэ ня ўведзен. Дагаворы паміж цэхамі і аддзеламі заводакіраўніцтва не заключаны. Няма таксама гаспадарчага дагавору з фабрыкай імя Клары Цэткін, якая забясьпечвае камбінат пауфабрыкатам. Між тым, з прычыны дастаўкі фабрыкай імя Клары Цэткін няправільнага асартымэнту панчох, на складзе фарбовачна-апрытурнага цэху ляжыць запас у 200.000 пар і ніхто не патрабуе ад работнікаў фабрыкі імя Клары Цэткін больш адказных адносін да сваіх абавязкаў. На 1100 рабочых і работніц ёсьць толькі 2 гаспадарча - разрахунковыя брыгады.

Наяўнасьць ураўнілаўкі, абязьлічкі, ігнараваньне сацыяльна-бытавых запатрабаваньняў рабочых і ІТР, ігнараваньне гаспадарчага разрахунку і і г. д. — усё гэта прывяло фабрыку да буйных недахопаў. Праграма трэцяга кварталу выкананa на 33,6 проц. за кастрычнік—на 62,7 проц.

У сваё апраўданьне, кіраўнікі фабрыкі высоўваюць «аб'ектыўную» прычыну, што камбінат пядаўна пушчан. Аднак, шматлікія факты, выяўленыя ўдарнікамі друку, гавораць зусім іншае. **У наяўнасьці ўсе магчымасьці для выкананьня прамфінпляну.**

Мы чакаем ад партыйнай і прафэсыянальнай арганізацый, ад гаспадарчага кіраўніцтва фабрыкі **рашучай перабудовы ўсёй работы на аснове поўнай рэалізацыі 6-ці ўмоў тав. Сталіна.** Мы, ударнікі друку — удзельнікі рэйду, з свайго боку абяцаем фабрычным арганізацыям і адміністрацыі актыўна дапамагчы ў ажыцьцяўленьні ўсіх мерапрыемстваў, якія часткова вызначаны ў часе рэйду і якія павінны яшчэ быць вызначаны — **для поўнай рэалізацыі ўказаньняў правадыра партыі тав. Сталіна.**

УДАРНІКІ ДРУКУ: Фэйгін, Жепязьняк, Зэлікзон, Марудзэ, Траян, Гофман, Якаўлеў, Гельфэт, Фрыдман, Віндэргэуз, Нэйдлін, Глобус, Левіт, Пятоцкая, Піталенка, Бас, Гальбрайх, Ідэль, Аветаева, Карашкова, Кузьмярова, Лазарэвіч, Мітальнікава, Рагамінскі, Кпяц, Коган (інжынэр), Каган, Генкіна, Мэрголіна, Гурэвіч, Рабінові, Крэслаўская, Паўлава, Расьлякова, Рэманава, Семенкіна, Студзянцова, Шлякава, Кандзінкіна, Саўчанка, Калюта, Барыш, Бязьменава, Бранзбург, Іёнаў, Жураўлёў, Якімаў, Трашчотін, Шчуплякоў, Дубальвіч, Алябастар, Пушкароў, Дыбанін, Апрыска, Хаўкін, Пазьняк, Перапечка, Нэймен, Міхалёўскі, Акімаў, Сямёнаў, Тарарын, Барановіч, Кузьняцоў, Іваноў, Гурыніна, Пыляніна, Шынкарэнка, Красоткіна, Ушалава, Сладкевіч, Іванова, Зямтур, Ярчанка, Мацьвеева, Папавіцкава, Васільева, Юдаскіна, Думава, Пятрыцкая, Науменка, Кадакова, Грышановіч, Кандзова, Барысава, Крумялевіч, Грынталенка, Занясенка, Ганчарова, Бялінскі, Рудзікава, Мудрынская, Арк, Зарубежны, Р. Максімаў.

Замест апэрацыйнага кіраўніцтва—склока

Добруская фабрыка «Герой працы», у сувязі са спыненьнем падачы торфу, стала.

Партыйны камітэт фабрыкі, фабком і гарком КП(б)Б запэўнілі ЦК КП(б)Б, што забясьпечаць ня толькі бесьперабойную работу фабрыкі, але і вынядуць яе ў бліжэйшы пэрыяд з тых прарываў, у якіх яна знаходзіцца на працягу ўсяго бягучага году.

Дзе-ж прычыны спыненьня фабрыкі?

Яны крыюцца ў тым, што партыйная арганізацыя ня была мабілізавана на бальшавіцкае змаганьне за поўную рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна, што партыйнае кіраўніцтва яўна ігнаравала рэалізацыю сакавіцкай пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове партыйна-масавай работы і перанясеньні яе цэнтру цяжару ў цізавое вытворчае зьвяно. Партыйны камітэт і дырэкцыя фабрыкі ня толькі не забясьпечылі штодзённым апэрацыйным кіраўніцтвам вядучых вучасткаў фабрыкі, а наогул кіравалі беспрадметна.

Гэта з асаблівай сілай выявілася на пагрузачнай і парасілавой станцыях, якія зьяўляюцца рашаючымі вучасткамі фабрыкі.

Безадказнасьць, абязьлічка, адсутнасьць клопатаў аб палянізаваньні матар'яльна-бытавых умоў рабочых, адсутнасьць партыйна-масавай работы, а ў выніку гэтага — цякучасьць рабочай сілы, вось кароткая характарыстыка становішча пагрузачнай. На балоце вялікія запасы добраякаснага (з нізкай вільготнасьцю) торфу. Аднак з прычыны таго, што ніхто ня ведае, у якім месцы ляжыць гэты сухі торф, на фабрыку падаецца апал вільготны, зусім ніякай калёрыйнасьці. Гэта справа да канца абязьлічана.

На працягу ўсяго лета будуецца на торфапагрузачнай інтэрнат для рабочых. Тэрміны будаўніцтва даўно прайшлі, а дом ня скончан. Пачаліся халады, на пагрузачнай патрэбны цяплушкі. Іх можна пабудаваць у 4-5 дзён. Між тым, за два месяцы з трох вызначаных цяплушак, пабудавана толькі адна.

Асобныя партыйцы і камсамольцы фабрыкі ня толькі не забясьпечылі авангардная ролі, а нават у некаторых выпадках пакідалі пагрузачную. Партком натураў хвасьцістам, ня прыцягваў дэзэртыраў да адказнасьці.

Фабрыка стала 25-га лістапада. Пляну-ж пуску няма і зараз. Дырэктар Юшкоў запэўняе, што ў яго галаве ёсьць меркаваньні, што ён іх 10-га сьнежня нават накінуў на паперу. Сакратар-жа парткому Эйсман сьцьвярджае, што пуск фабрыкі магчымы толькі праз некалькі месяцаў.

Партком, замест бальшавіцкай мабілізацыі мэс на неадкладны пуск фабрыкі, стварыў бяспрынцыпную групу поўшчыну, разводзіў склокі.

10-га кастрычніка ў Добруш выехала камісія гаркому, назаўтра яе вывады ставілі на парткоме фабрыкі. На гэтым пасяджэньні менш за ўсё гаварылася пра пуск фабрыкі, а пытаньне зьведзена было да разбору галоўным чынам склочных спраў.

Учора бюро гаркому, разглядзеўшы пытаньне аб добрускай фабрыцы, пастанавіла зьняць з работы сакратара парткому Эйсмана і дырэктара Юшкова, як нядзюльных забясьпечыць пуск фабрыкі, і перадаў справу аб іх у кантрольную камісію.

Карачун, Самуцін, Манькоў.

Вагон павінен працаваць 8 гадзін у суткі

ПРАЗ МАРШРУТЫЗАЦЫЮ УЗЬНІМЕМ ЯГО КАРЫСНУЮ РАБОТУ

Узьняць эфэктыўнасьць работы вагоннага парку

Выкананьне плянаў зімовых перавозак патрабуе максымальнага павышэньня эфэктыўнасьці скарыстаньня парову з паравозным і вагоннага парку.

Адным са сродкаў дасягненьня гэтага зьяўляецца маршрутызацыя цягнікоў.

Карэспандэнцыя калектыўнага рабкора «Зьвязды» — рэдкалегіі шматтыражкі «На сацыялістычных рэйках» сыгналізуе, што справа маршрутызацыі і спэцыялізацыі цягнікоў па галоўных вузлох Гомельскага раёну недаацэньваецца. Ніякай работы ў сувязі з маршрутызацыяй не праведзена.

Рашуча змагаючыся з апартуністычным супраціўленьнем маршрутызацыі партыйныя арганізацыі чыгунак павінны забясьпечыць рэалізацыю загаду тав. Андрэева, які абавязваў да 1-га сьнежня давесьці маршрутызацыю цягнікоў па важнейшых грузах мінімум да 50-60 проц. усіх перавозак грузаў па-чыгунцы.

Загад тав. Андрэева абавязвае так сама наладзіць рэгулямернае рэгуляваньне руху цягнікоў на працягу сутак, ліквідуючы неарганізаваны рух чачкамі. Факты калектыўнай карэспандэнцыі сьведчаць, што кіраўнікі станцый Карасьцень ня выконваюць гэтай дырэктывы.

На станцыі Менск парушаецца загад тав. Андрэева аб давядзеньні сярэдня-сутачнай работы пыстэрны ня менш як да 11 гадзін. Вялікія прастоі вагонаў па станцыі Замасточча і Чалянкавічы.

Праз мабілізацыю ўвагі чыгуначнікаў на пытаньні барацьбы за ліквідацыю абязьлічкі вагонаў, за маршрутызацыю і спэцыялізацыю цягнікоў партарганізацыя даб'ецца перамогі на фронце максымальнага скарыстаньня вагоннага парку, павялічэньня звароту вагонаў, выкананьня плянаў перавозак. У гэтай справе значна дапаможа рэалізацыя наступнага пункту загаду тав

Брыгадзір брыгады па зьмене шпал т. Ганчароў (ст. Талачына)

Андрэева: «Увесьці прэміяваньне работнікаў сартовачных станцый, якія складаюць маршрутныя цягнікі, а таксама работнікаў па маршрутызацыі ў раёнах і дырэкцыях дарог з тым, каб школа прэміяваньня была складена з улікам дальнасьці прабегу маршрута і мінімальных прастояў вагонаў у масцох фармаваньня цягнікоў».

4 суткі чакаў вагон рамонту

На станцыі Замасточча МББ пагружаныя вагоны прастойваюць чакаючы прычэпкі да зборных цягнікоў па 6 і больш гадзін. Вось некалькі прыкладаў. 10-га лістапада вагоны з № 864321 і 465573 прасталі па 5 гадзін кожны. 20 лістапада вагоны № 426500 прастаяў 69 гадзін і г. д.

Яшчэ горш справа з рамонтам вагонаў, якія адчапляюцца ад цягнікоў па тэхнічных няспраўнасьцях.

24-га лістапада ад цягніку № 78 быў адчэплен па тэхнічных няспраўнасьцях вагон № 427778, які прастаяў 168 гадзін. Чакаючы сьлесароў гэты вагон прастаяў 4 сутак.

Сьлесары Багданаў і Жаўронак рабілі нядобраякасны рамонт; падшыпнік падагналі крыва, шайку добра не абтачылі. У выніку вагон быў зноў забракаваны, як няспраўны. Толькі на 7-е суткі гэты вагон быў прычэплены да цягніка. Такіх фактаў нядобраякаснага рамонту і доўгага чаканьня на куль прыбудуць сьлесары рамантаваць можна прывесьці шмат. Вагон № 34160, чакаючы сьлесароў прастаяў 56 гадзін, № 336709 — 48 гадзін, № 529291—33 гадз. і г. д.

ЯНКА ДЗЬМІТРАЎ.

Маршрутызацыя не праводзіцца

Важнейшым сродкам павялічэньня эфэктыўнасьці скарыстаньня вагоннага парку зьяўляецца маршрутызацыя і спэцыялізацыя цягнікоў.

На ст. Жлобін-Калінкавічы маршрутызацыя праводзіцца.

Распрацаванага парадку складаньня маршрутаў няма. Норм прастою вагонаў ня ведаюць ня толькі низавыя працаўнікі, а нават і самі кіраўнікі маршрутызацыі.

Манэўравыя і саставіцельскія брыгады як належыць не праінструктаваны і таму працуюць па-старому. Манэўровыя паравозы пастаяннага графіку ня маюць і часта бывае, што адзін паравоз выконвае манэўровую работу па сартовачнай і пасажырскай станцыях. Узгодненасьці ў рабоце дыспэтчара з загадчыкам манэўраў няма. Паравозы зьнімаюцца дыспэтчарам з адной працы і адсылаюцца на другую, бяз ведама загадчыка манэўраў і інш.

Ня гледзячы на тое, што ў Гомелі маршруты складаюцца па 14-ці групах, усё-ж спэцыялізацыі шляхоў асабліва па ст. сартовачная, няма. Пры разборцы цягніка некалькі груп скідаюцца на адзін-два шляхі, а потым зноў выцягваюцца. Асьвятленьне шляхоў не праведзена.

У выніку такога становішча мы маем перапрастой транзітных вагонаў па Калінкавічах. Вагоны замест 9.7 гадз. (у лістападзе) фактычна прастойвалі 11 гадзін.

Паводле існуючай сыстэмы заработнай платы, саставіцелі за выкананьне вымяральніка атрымліваюць 25 проц. падбаўкі, а стрэлачнікі — 20 проц., але гэты гэтым не прадугледжваецца аўтыўнасьць паасобных стрэлачнікаў у справе выкананьня вымяральнікаў манэўровых работ. Кожны стрэлачнік, ня гледзячы на тое, ці прымаў ён які ўдзел у манэўровай рабоце, ці не, усё роўна атрымлівае 20 проц. падбаўкі. Такое становішча не зацікаўлівае стрэлачнікаў павышаць сваю кваліфікацыю, бо больш кваліфікаваных стрэлачнікаў ставяць на цяжкія пасты, а прыработак ім улічваецца адполькавы.

Вельмі тармозіць справу маршрутызацыі і манэўровых работ адсутнасьць пляніраванага руху цягнікоў. Часамі бывае так, што цягнікі на станцыю прыбываюць падрад. Так, з Карасьценю на Калінкавічы 20-га лістапада за 4 гадзіны і 35 хвіл. адпраўлена 6 цягнікоў (№ № 852, 870, 854, 856, 832, 952) у той час, калі з рэшты дня цягнікі амаль зусім не паступалі. Такое становішча бязумоўна ня толькі не дае магчымасьці складаць маршруты, а нават затрудняе выкананьне манэўраў і работы станцыі. Апрача таго гэткае становішча сьведчыць аб тым, што дыспэтчары да самага апошняга часу ня кіруюць, а толькі фіксуюць рух цягнікоў.

Ня лепш робіць і Жлобін, які сыстэматычна шле ў Калінкавічы цягнікі ў самым хаотычным становішчы, ня выконваючы ніякай работы па спэцыялізацыі іх. 23-га лістапада ён пагналаў цягнікам № 273 4 цыстэрны, № 279 — 70 цыстэрнаў, 281 — 2 цыстэрны. 24 лістапада цягнікам № 870 — 5 цыстэрнаў, 856 — 2 цыстэрны, 27 лістапада цягнікам № 862—2 цыстэрны, 856—2, 870—23.

Такія адносіны да складаньня цягнікоў іншы, як злачынствам назваць нельга.

Грамадзкая думка рабочых пакі справы маршрутызацыі ня створана. Сацсаборніцтва не разгорнута. Рабочым нават не растлумачана, якое значэньне мае справа маршрутызацыі павялічэньні працы вагону.

Выразнасьць, правільная арганізацыя працы, вывучэньне справы маршрутызацыі і ўсьведамленьне яе роли і значэньня ёсьць галоўнае, што забясьпечыць выкананьне загаду тав. Андрэева.

Калектыўны рабкор «Зьвязды» — шматтыражка «На сацыялістычных рэйках».

На ст. Смалявічы загад т. Андрэева не прапрацавон

На станцыі Смалявічы МББ загад тав. Андрэева аб асеньня-зімовых перавозках дагэтуль яшчэ не прапрацаваны. Прычына гэтага — адсутнасьць належнага партыйнага і прафэсыянальнага кіраўніцтва. Сярод некаторай часткі малаасьвядомых рабочых-чыгуначнікаў на чале з былым афіцэрам Кашалем М. існуюць рваўцкія настроі. На агульным сходзе рабочых па справаздачным дакладзе ТСТ гэты былы афіцэр выступіў з дэмагогіяй, што,

Лічбы галасуюць за аграмінімумі

Я. ЧЫКУН

У гэтым артыкуле мы маем на мэце ахапіць пытаньні агратэхнікі, ад якіх залежыць ураджайнасьць у калгасах. Прыведзены ніжэй матар'ял паказвае, як ігнараваньне некаторых агра-вытворчых мерапрыемстваў зьнижае даходнасьць гаспадаркі.

Зяблева, уздым папару, адбор насеньня і пасеў—вось на прыкладзе гэтых мерапрыемстваў можна ўбачыць магчымасьці, якія заложаны ў аграмінімуме. Можна ўбачыць, што поўнае і своячасовае выкананьне ўказаньняў агранамії павялічыць даходнасьць гаспадарак без укладаньня дадатковых сродкаў.

***

Калгас «Чырвоная Полаччына» (Вушацкі раён) мае шмат посьпехаў у справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня. Але побач ёсьць такі прабел, які зьяўляецца характэрным для большасьці нашых калгасаў. Гэта ігнараваньне аграмінімуму.

Адсутнасьць шырокай работы за аўладаньне агратэхнікай і с.-г. навукамі —вось прычыны, што калгас селёта мае недабор ураджаю на 11.760 руб.

I. Зяблева

Пачнем з зяблева, якое зьяўляецца пачаткам апрацоўкі глебы пад яравыя засевы.

Правільна праведзенае зяблева ўзьні мае ўраджайнасьць яравых у сярэднім на 20%. У большым эфэкт дае зяблева, калі яно праведзена своячасова, г. зн. у жніўні-верасьні месяцы. Чым раней узьнімаецца зяблева, адпаведна з гэтым павышаецца яго эфэктыўнасьць. Гэта даказана нашымі беларускімі дасьледчымі ўстановамі на аснове практыкі.

Матар'ялы Тураўскай дасьледчай станцыі даюць такі малюнак: Пры асеньнім зяблеве ўраджайнасьць аўса павялічваецца на 58 проц. супроць веснавога ворыва. Ураджайнасьць бульбы пры асеньнім ворыве павялічваецца на 25 проц.

Гэты прыклад паказвае, што асеньняе зяблева павінна быць першым крокам кожнага калгасу, які хоча атрымаць высокі ўраджай.

Мэта зяблева—зьнішчыць пустазельле, якое, будучы зараным, зчвае, гніе і дае некаторую частку спажыўных матэрый для глебы, зьнішчыць жывых шкоднікаў, што хаваюцца ў зямлі, лешч вырабіць глебу. Пасьля зяблева пустазельле ўжо ня цягне спажыўматэрый з глебы, не заглушае культурных расьлін. Але для таго, каб пустазельле перагніло і давала карысьць глебе, яго трэба заворваць чым раней, тады яно да наступленьня халадоў можа перапрэць, чаго ня бывае тады, калі зяблева робіцца перад самымі марозамі.

Вусень (белыя чарвякі), якая павінна даць у наступным годзе жывых шкоднікаў у выглядзе розных казюлек, пры ворыве выварочваецца на паверхню і гіне.

Калгас «Чырвоная Полаччына» ў гэтым годзе засеў 260 га яравых выключна па веснавым ворыве. Гэта плошча не зяблілася. Ведаючы, што зяблева ўзьнімае ўраджайнасьць на 20 проц. у сярэднім, можна падлічыць страты калгасу «Чырвоная Полаччына» па асобных культурах.

Лён—пасеў 80 га. Звычайны ўраджай з га 2 тоны трасты і 2 цэнт. семя. Страты па ільне роўны 32 тонам трасты і 32 цэнт. ільнасемя, што ў пераводзе на грошы складае 1.500 руб.

Авёс—пасеў 40 га. Ураджайнасьць 10 цэнт. зерня і 15 цэнт. саломы. Страты: 80 цэнт. зернем і 120 цэнт. саломай; грашыма—880 руб.

Бульба—пасеў 54 га. Сярэдняя ўраджайнасьць — 10 тон. Страты—100 тон, у пераводзе на грошы—3.000 руб.

Гарох—24 га, сярэдняя ўраджайнасьць 10 цэнт., страты 48 цэнт. гароху на суму 500 руб.

Віка—62 га. Сярэдняя ўраджайнасьць—4 тоны. Страты 48 тон сена вікі, у пераводзе на грошы—1.680 руб.

Ураджайнасьць бярэцца сярэдняя для Вушацкага раёну за апошнія тры гады.

Такім чынам, калгас «Чырвоная Полаччына» з-за ігнараваньня зяблева ў 1930 годзе мае сёлета страт: зерня—128 цэнт., бульбы—100 тон, саломы і сена—168 тон, ільнатрасты—32 тоны, ільнасемя—32 цэнт. На агульную суму—7.560 руб.

II. Папар

Падрыхтоўка глебы пад азімыя засевы — ворыва папару—другое ня менш важнае зьвяно ў барацьбе за ўраджайнасьць.

Правільная апрацоўка папару заключаецца ў тым, што яго патрэбна ўзараць як можна раней вясною, а то і ўвосень, і ўвесь час да пасеву трымаць папар у культурным выглядзе, г. зн. даць магчымасьць папару назбіраць як найбольш спажыўных матэрый для жыўленьня будучых пасеваў азімины. Культурны папар патрабуе за сабой догляду, які заключаецца ў прыватнасьці ў забароне скарыстаньня на пару пад выпас на пасьбу жывёле.

Добра падрыхтаваная глеба пад азімыя дае прыбаўку ўраджаю параўнальна з ураджаем. На папары, які ня меў правільнага догляду і апрацоўкі, мінімум 10 проц. Гэта даказана вопытамі Заходняй дасьледчай станцыі.

У «Чырвонай Полаччыне» пасеў жыта, які сёлета зьнят, роўны 200 га. Палова плошчы перад пасевам скарыстоўвалася пад выпас і мела невыстарчальную апрацоўку. Сярэдняя ўраджайнасьць жыта для калгасу «Чырвоная Полаччына» за апошнія гады роўна 9 цэнт. Такім чынам калгас недабраў, з прычыны невыстарчальнай апрацоўкі папару, 90 цэнт. збожжа і 180 цэнт. саломы. У пераводзе на грошы гэта складае 1.100 руб.

Ва ўмовах БССР, як краіны разьвіцьця жывёлагадоўлі, лешч за ўсё ўвосьць папары, занятыя пасевамі розных кармовых культур, якія пакідаюць пасьля сябе ў глебе шмат спажыўных матэрый.

III. Насеньне і пасеў

Гатункове адсартаванае і пратручанае насеньне, правільны засеў адыгрываюць адну з рашаючых роляй у справе ўзьняцьця ўраджайнасьці і зьяўляюцца неадлучнай часткай аграмінімуму.

Гатункове насеньне павінна быць адсартавана і пратручана. Пры сартаваньні адбіраецца на насеньне больш поўнаважкае, здаровае зерня; яно дае роўныя і здаровыя ўсходы. Ні адно зерня, якое адсартавана, не прападае дарма. Пратручаньне насеньня дае магчымасьць упікнуць заражэньня ўраджаю ячменю і пшаніцы сажай, жыта—ражкамі спарыньні.

Што датычыць самога пасеву, то яго трэба рабіць радковым, асабліва жыта, пшаніцу, ячмень і інш. каласістыя. Радковы пасеў мае надзвычай важнае значэньне. Ён дае роўныя ўсходы, роўны рост і адначасовае пасьпяваньне. Упікаецца так званая стракатасьць ураджаю, калі адна лапіна перасьпела і асыпаецца, а другая яшчэ стаіць недасьпелай, як гэта бывае пры ручным пасеве. Гэта атрымліваецца таму, што сеянае рукамі насеньне кладзецца нярэўна ў глебу і дае нярэўныя ўсходы і рост, чаго няма пры радковым пасеве, дзе сашнікі сяняркі салзяць насеньне на пэўную і роўную глыбіню, неабходную для найлепшага росту.

Апрача гэтага радковы засеў эканомінь палову цэнтнэра насеньня збожжавых на кожны засеяны гэктар. Устаноўлена, што толькі радковы пасеў сартаваным насеньнем дае 10 проц. надбаўкі ўраджаю.

Калгас «Чырвоная Полаччына» ў гэтым годзе меў 220 га ручнога пасеву. Не пратручаным насеньнем засеяна 100 га і 30 га несартаваным. Калі ўлічаць страты пры пасеве азімых у разьмеры 30 проц., то недабор ураджаю будзе роўны 130 цэнт. збожжа і 170 цэнт. саломы, што ў пераводзе на грошы складае 1.400 руб.

Своячасовасьць пасеву таксама значна ўплывае на ўраджайнасьць. Устаноўлена дасьледчымі ўстановамі, што своячасовы пасеў дае прыбаўку да 2 цэнт. збожжавых на 1 гэкт. У калгасе «Чырвоная Полаччына» пасеў як яравых, так і азімых быў вельмі расьцягнут. Яравыя засявалися да канца чэрвеня месяца, а азімыя да сярэдзіны кастрычніка. У сярэднім 30 проц. усіх пасеваў праведзена несвачасова. І калі ўзяць толькі збожжавыя, то ад несвачасовага пасеву страты ўраджаю дасягаюць у сярэднім 150 цэнт. збожжа і 250 цэнт. саломы, ці 1.700 руб.

IV. Кошт аграмінімуму

Калі ўзяць толькі некаторыя галоўныя галіны паляводчай гаспадаркі калгасу «Чырвоная Полаччына», дзе ня ўжываўся аграмінімум, то страты дасягаюць: 498 цэнт. збожжавых, 100 цэнт. бульбы, 32 тон ільнатрасты, 32 цэнт. ільнасемя, 768 цэнт. сена-саломы, коштам на суму ў 11.760 руб. Кошт аграмінімуму калгасу «Чырвоная Полаччына» роўны 11.760 руб.

Прычым напамінаем, што гэта ўзяты мінімальныя лічбы, а фактычна страты калгасу «Чырвоная Полаччына» ад няўжываньня аграмінімуму куды большыя, бо апрача таго, што лічбы пры падлічках страт браліся сярэднія, а то і менш таго, яшчэ не падлічаны страты ад веснавой пасьбы скаціны па сенажацях, ад пасьбы скаціны па пасевах жыта ўвосень і г. д. Вядома, што страты ад пералічаных пунктаў дасягаюць вялікіх разьмераў.

На кожны гэктар пасеву (560 гэкт.) калгасу «Чырвоная Полаччына» патае страт на 21 рубель, пры сярэдняй даходнасьці аднаго га збожжавых у 80-90 руб. Такім чынам, страты ад няўжываньня самых неабходных правіл аграмінімуму ў палявой гаспадарцы калгасу складаюць ня менш 25 проц.

V. Вывады

Яны напрошваюцца самі. Зяблева правільная апрацоўка папару, радковы пасеў гатункоўным і адсартаваным насеньнем—толькі гэтыя мерапрыемствы, без якіх ня можа абыйсьціся і адна буйная сацыялістычная зямлеробчая гаспадарка, забясьпечваючы ўздым ураджайнасьці на 25-30 проц.

Барацьба за павышэньне ўраджайнасьці—важнейшае зьвяно у ажыцьцяўленьні цэнтральнай задачы—арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

На ўвядзеньне аграмінімуму патрэбна непасрэдных матар'яльных затрат, апрача правільнага і своячасовага выкананьня неабходных палевых работ. Ніхай запамятаюць усе, што зрыў аграмінімуму прыносіць вялізарнейшыя страты для кожнага калгасу і ўсёй краіны наогул. Кожны калгас павінен падлічыць свае страты ад таго, што ён ня ўжываў (палкам ці часткова) аграмінімуму, і безадкладна ўзяцца за ўсамернае ўвядзеньне яго ва ўсе галіны гаспадаркі калгасу.

За ўвядзеньне аграмінімуму патрэбна ўзяцца неадкладна, з сёньняшняга дня. Безадкладна трэба пачаць рыхтавацца да трэцяй бальшавіцкай веснавой песеўнай кампаніі. Калгасы павінны будуць у часе веснавой пасеўнай кампаніі рэалізаваць пастановы партыі і ўраду аб узьняцьці ўраджайнасьці, дзе аграмінімуму адводзіцца цэнтральнае месца. За зіму аўладаць ведамі агранамії, узьняць агратэхнічны ўзровень калгасьніка. Аграмінімум ва ўсе галіны калгаснай гаспадаркі—вось лёзунг сёньняшняга дня.

ЗНОЎ ШЭСЬЦЬ ПРЫГАВОРАЎ СЬМЕРЦІ

Масавая расправа польскага фашызму над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі

ВАРШАВА, 13. Апошнія дні ў Польшчы зноў прынесьлі рад пакараньняў сьмерцю, катаржных прыгавораў і масавых расправаў над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі. За апошнія 4 дні прыведзены ў выкананьне 6 сьмяротных прыгавораў. Лодзінскі рабочы Купынскі прыгаворан за пашырэньне «антыдзяржаўных» лістовак да 2-х год катаржнай турмы.

У Тарнопалі 1 Чартковае рэвалюцыйныя рабочыя засуджаны да 6 і 3 год катаргі.

Акруговы суд у Чэнстахове разглядаў справу групы рабочых, абвінавачаных у прыналежнасьці да кампартыі. Засуджаны: **Дамагальскі** і **Блюмэнфранц**—па 5 год катаргі, **Засеня**—па тры гады і **Гайткоўскі**—на 1 год.

У Петракове акруговы суд засудзіў на год турмы рабочага з Тамашова М. Розэнбліта па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да камсамолу.

Акруговы суд у Пінску прыгаварыў да 6 гадоў катаржнай турмы беларускага селяніна **Лукашука** і двух іншых сялян да 3-х гадоў турэмнага зьняволеньня па абвінавачаньні ў «антыдзяржаўнай дзейнасьці». Адначасова акруговы суд у Беластоку на выязной сэсіі ў Бельску прыгаварыў **Сьцяпана Амельянюка** да 4-х гадоў катаржнай турмы па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да кампартыі (ТАСС).

Дэманстрацыя беспрацоўных жанчын у Вільні

ВІЛЬНЯ, 12. Учора пад вечар перад ваяводзкім урадам адбылася бурная дэманстрацыя беспрацоўных жанчын. Жанчыны дамагаліся працы, хлеба і дапамогі, якое яны не атрымліваюць ужо некалькі месяцаў. Беспрацоўных жанчын разагнала паліцыя.

Арышты рабочых і сялян у Келецкім павеце

ВАРШАВА, 11. Сярод рабочых Келец і наўкольнага сялянства паліцыя правяла масавыя арышты. Паводле паведамленьня прэсы арыштавана некалькі дзесяткаў асоб. Арыштаваных абвінавачваюць у прыналежнасьці да КПП. Падрабязнасьці арыштаў трымаюцца ў таямніцы.

***

ВІЛЬНЯ, 11. Віленская буржуазная прэса паведамляе, што гэтымі днямі Лідзкая дэфэнзыва правяла ў павеце масавыя арышты сялян. Арыштаваных абвінавачваюць у прыналежнасьці-нібы да КПЗБ, у актыўнай «антыдзяржаўнай» рабоце, якая заключылася ў агітацыі за нявыплату падаткаў і нявыхад на шарваркі (прымусовыя работы).

Кіраваў гэтай дзейнасьцю нібы настаўнік літоўскай пачатковай школы ў Дубічах — Альфонс Бэймаровіч, у якога падчас рэвізіі, як паведамляе прэса была знойдзена нелегальная літаратура на беларускай, літоўскай і польскай мовах. Настаўніка абвінавачваюць у тым, што ён праводзіў антыдзяржаўную работу сярод вучняў.

Лёкаут 15.000 тэкстыльшчыкаў у Лодзі

ВАРШАВА, 11. З 15-га сьнежня прадпрыемцы тэкстыльнай прамысловасьці спыняюць на «рад тыдняў» работу ўсіх тэкстыльных фабрык. Капіталісты тлумачаць лёкаут неабходнасьцю «рацыяналізацыі працы». Дзякуючы гэтай «рацыяналізацыі» ў «бясплатны водпуск» на неабмежаваны час ідуць 15.000 рабочых.

Гераічная барацьба рабочых шаўковай прамысловасьці Лодзі

ВАРШАВА, 12. У Лодзі ўжо дзесяты тыдзень працягваецца забастоўка рабочых шаўковай прамысловасьці. Забастоўкай ахоплены ўсе шаўковыя фабрыкі Лодзі. Бастуе 4.000 рабочых. Гэтымі днямі адбылася канфэрэнцыя паміж прадстаўнікамі рабочых і прадпрыемцаў. Да згоды ня прышлі. Прадпрыемцы не прынялі ўсіх патрабаваньняў рабочых. Рабочыя салідарна пастанавілі баставаць далей.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Новы від цэглы

Лябараторыя будаўнічай кераміці інстытуту прамысловасьці праводзіць вопыты па скарыстаньні глін БССР для выпрацоўкі порыстай цэглы (яна складаецца з тлустай гліны, пілавіньня і торфу).

Порыстая цэгла памяншае каэфіцыент цеплаправоднасьці, што дае магчымасьць памяншаць таўшчыню сьцен пры кладцы: замест звычайнай кладкі ў 2 з пал. цэглы, даволі паўтары цэглы.

Вопыты далі добрыя вынікі.

Паводле пляну на 1932 г. Віцебскі, Полацкі і Бабруйскі цэгелі заводы будуць пераведены на выпрацоўку порыстай цэглы.

Лябараторыяй праводзіцца таксама дасьледчая работа па выпрацоўцы цэглы метадам сухога прэсаваньня. Эканамічны эфэкт сухога прэсаваньня ў тым, што завод можа працаваць на працягу ўсяго году з большай прадукцыйнасьцю, бо зусім адпадае сушка сырцу.

Мэханізацыя транспарту на шклозаводах

На шклозаводах БССР ідзе рацыяналізацыя ўнутры заводзкага транспарту. На заводзе «Кастрычнік» пабудаваны тры падважныя дарогі, якія злучаюць склады сырцу з цэхамі. На заводзе імя Домбаля пабудавана падважная дарога, якая злучае шліфавальны цэх са складам.

Вопыт перадавікоў фінпляну—адсталым раёнам

Савецкі Саюз дабіўся значных посьпехаў ва ўзмацненьні фінансавай абароназдольнасьці краіны, у выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў. БССР таксама мае значныя дасягненьні на гэтым адказнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва. За апошні год у два разы павялічылася сума мабілізаваных сродкаў насельніцтва. Толькі праз пазыкі і ашчадкасы атрымана звыш 100 млн. руб.

Але ўсё-ж БССР адстае ад перадавых рэспублік і абласьцей Савецкага Саюзу. Асноўнымі прычынамі адставаньня зьяўляецца недаацэнка мабілізацыі сродкаў і слабасьць арганізацыйна-масавай работы ў радзе раёнаў.

Першы ўсебеларускі зьлёт ударнікаў фінансавага фронту паказаў, што ў гэтай галіне за апошні час ёсьць значны пералом.

Сам факт, што на зьлёце сабраліся прадстаўнікі буйных прадпрыемстваў, калгасаў, партыйных і прафэсіянальных арганізацый, мясцовага друку, камсамолу, чырвонаармейцаў і настаўніцтва — паказвае, што выкананьне фінпляну становіцца справай шырокіх рабочых і калгасных мас.

Матар'ялы зьлёту прадстаўляюць надзвычайную каштоўнасьць у адносінах скарыстаньня і пашырэньня форм і мэтадаў работы перадавых раёнаў, сельсаветаў і заводаў.

Зьлёт паказаў з усёй выразнасьцю, што посьпехі лепшых гарадоў і раёнаў тлумачацца ў першую чаргу правільнымі сыстыматычнай масавай работы і выразным кіраўніцтвам партарганізацый.

Менск, Віцебск, Гомель мабілізавалі на выкананьне пляну буйнейшыя прадпрымствы: у Менску заводы імя Варашылава, «Камунар», імя 1 мая, «Ударнік»; у Віцебску ф-ку «Прафінтэрн», у Гомелі заводы імя Ланцуцкага, Гомельмаш і г. д. Гэтыя заводы зьявіліся апорнымі пунктамі правільненьня ўсіх фінансавых мерапрыемстваў. Свой вопыт барацьбы за фінплян яны пераносілі на іншыя прадпрыемствы шляхам пасылкі буксірных брыгад для дапамогі адстаючым, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Перадавыя прадпрыемствы далі ўзорныя прыклады фінансавай работы.

З кожным днём расьце лік заводаў, якія змагаюцца за першынства. У Віцебску зараз спаборнічаюць за пераход на сьцяг гарпрафсавету прадпрыемствы, якія ня так даўно былі на апошнім месцы па мабілізацыі сродкаў (ф-ка імя Лекерта, «Сьцяг індустрыялізацыі»).

Мабілізацыя сродкаў становіцца справай гонару цэлых калектываў.

Толькі на адным заводзе імя Ланцуцкага, які шэфствуе над гомельскім зэрфа, налічваецца звыш 100 сапраўдных актывістаў-ударнікаў.

Выключнае значэньне набывае вопыт перабудовы фінработы на вёсцы, якая да апошняга часу ўсё яшчэ зьяўляецца найбольш адстаючым вучасткам фінансавага фронту.

Пасьпяховае выкананьне фінпляну ў перадавых раёнах тлумачыцца строгай увязкай гэтай работы з усімі гаспадарча-палітычнымі задачамі на вёсцы, рашучым змаганьнем з апартуністычнай стаўкай на чарговасьць кампаній. У гэтых раёнах на барацьбу за фінплян былі мабілізаваны партарганізацыі, камсамол, прафсаюзы.

У Сіроцінскім раёне добра паладжана работа камісіі садзейнасьці, вакол якіх згрупован актыў з калгаснікаў, камсамольцаў, настаўнікаў. Сыстэматычна заслухоўваюцца даклады лепшых і адстаючых сельсаветаў, ашчадкас, сельскагаспадарчых і г. д. Уведзена сыстэма прэміяваньня сельсаветаў і калгасаў. Ліквідавана абязьлічка: на кіраўніка кожнай арганізацыі ўскладзена пэўная адказнасьць за выкананьне заданьня. Скарыстоўваецца радыё-газэта.

Аналягічная работа разгорнута ў Заслаўскім, Бабруйскім, Лепельскім, Хойніцкім і радзе іншых раёнаў.

Паасобныя раёны, якія па-баявому ўключыліся ў фінэстафэту, змаглі ад рагожнага сьцягу выйсьці ў перадавыя рады барацьбітоў за фінплян. Так, Церахаўскі раён, які ў другім квартале атрымаў рагожны сьцяг, зараз заняў трэцяе месца ў БССР. Слуцкі, Сеньненскі, Асіпавіцкі і Чачэрскі раёны таксама дабіліся пэўнага пералому.

Ня менш цікавыя рапарты паасобных сельсаветаў, калгасаў і ўдарнікаў аб выніках фінансавай работы.

Ударнікі калгасу імя Будзённага, «Чырвонага Берага» і інш. паведамілі зьлёту аб перавыкананьні пляну загатовак, заданьняў па мабілізацыі сродкаў, аб стварэньні пастаяннага фінансавага актыву, аб дапамозе адсталым калгасам і аднаасобнікам. Дэлегаты адзначалі, што гэтых вынікаў яны дабіліся толькі дзякуючы ўпартай рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, па ліквідацыі ўраўнілаўкі, абязьлічкі і ўвядзеньні зьдзельшчыны.

Аднак, не па ўсіх раёнах мы маем такое становішча. Паасобныя раёны (Лоеўскі, Уваравіцкі, Чырвонапольскі і інш. не паслалі пакат дэлегатаў на зьлёт. Гэта лепш за ўсё паказвае іх дрэнную работу, паказвае, што яны не адважыліся зрабіць справаздачу аб сваёй «дзейнасьці» перад перадавікамі фінансавага фронту.

Адказнейшая задача — гэта заразжа пашырыць вопыт лепшых перадавых раёнаў на адсталыя раёны, сельсаветы і калгасы.

Армія ўдарнікаў фінансавага фронту павінна быць папоўнена новымі тысячамі лепшых ударнікаў — рабочых, калгаснікаў, камсамольцаў, настаўнікаў.

Зьлёт ударнікаў узяў на сябе абавязацельства — дабіцца датэрміновага выкананьня пляну IV кварталу і заключыў сацдагавор з Закаўказьлем. Па рэалізацыю гэтага сацдагавору павінны быць мабілізаваны шырокія масы рабочых, калгаснікаў, працоўнага сялянства.

МЕЛЬНІКАЎ.

Нямецкія прамыслоўцы пераводзяць свае прадпрыемствы заграніцу

БЭРЛІН, 13. «Эміграцыя» з Германіі прамысловых прадпрыемстваў ня спыняецца. Сьледам за прадпрыемствамі гарбарнай прамысловасьці Офэнбаха і Франкфурта пераносяцца заграніцу тэкстыльныя прадпрыемствы, якія знаходзяцца ў даліне р. Бунэр. Адна з буйнейшых фабрык гумовай тасьмы ў Бармэне ўжо перанесена ў Англію. Перанос нямецкіх прадпрыемстваў заграніцу адбываецца побач з эміграцыяй спэцыялістаў і майстроў.

У Германіі прыхільнікі інфляцыі сустракаліся да гэтага часу толькі ў колах цяжкой прамысловасьці і аграрнага капіталу. З кіраўнікоў палітычных партый у карысьць інфляцыі выказаліся пакуль толькі Гугенбэрг і Гітлер. Цяпер да прыхільнікаў інфляцыі далучыўся выдатны эканаміст «Бэрлінэр Тагеблят» Фэлікс Пінэр, вядомы да гэтага часу, як праціўнік усялякіх экспэрымэнтаў з нямецкай валютай. Пінэр прапануе правесьці ў заканадаўчым парадку дэвальвацыю з тым, каб марка каштавала ў далейшым ня 100 пфэнігаў, а 75-80.

Як гэта ня дзіўна, але сэнсацыйная прапанова Пінэра ня выклікала амаль ніякіх адмоўных водгукаў у самой Германіі. Абураючыя і пратэстуючыя водгукі даносяцца выключна з-за граніцы. Адлюстроўваючы неспакой крэдытораў Германіі, «Нэйе Цурыхэр Цэйтунг» называе плян Пінэра «канфіскацыяй прадастаўленых Германіі крэдытаў».

Масавае закрыцьцё фабрык і заводаў у Германіі

БЭРЛІН. Масавае закрыцьцё заводаў і фабрык і банкрутстваў гандлёвых фірм ва ўсіх раёнах Германіі прыводзіць да бесьпрацоўнага і шпаркага росту беспрацоўя. У **Прыморскай вобласьці** колькасьць беспрацоўных павялічылася за другую палову лістапада на 12.500 чал., дасягнуўшы на 1-га сьнежня 349.630 чал. З іх дапамогу на беспрацоўі атрымліваюць усяго 76 тыс. беспрацоўных. У цэнтры Рурскай вобласьці — **Эсэне**—колькасьць беспрацоўных дасягае 74.871 чал. Такім чынам у буйнейшым вугальным і мэталюргічным цэнтрах Германіі кожны 9-ты рабочы выкінут з вытворчасьці.

У тэкстыльным цэнтры Саксоніі—**Хэмніцы**—беспрацоўе ахапляе 62.931 чал. г. зн. беспрацоўным зьяўляецца кожны 6-ты жыхар Хэмніцу. У Эрфурце (Цюрынгія) 22.593 беспрацоўных (кожны 7-мы жыхар гораду беспрацоўны). Колькасьць беспрацоўных у Эрфурце павялічылася ў параўнаньні з мінулым годам па 40 проц.

Вэнгрыя напярэдадні банкруцтва

ВЕНА, 12. На ўчарашняй канфэрэнцыі вэнгерскай партыі прэм'ер-міністар Карольі паведаміў, што ўрад зьбіраецца весьці перагаворы з замежнымі крэдыторамі аб прадастаўленьні мараторыя для замежных даўгоў і аб зьніжэньні процантаў па гэтых даўгох. У вэнгерскіх палітычных і эканамічных колах заява прэм'ер-міністра тлумачыцца, як укоснае прызнаньне неплацёжаздольнасьці Вэнгрыі. У вэнгерскіх эканамічных колах панча моцны непакой з-за рэзкага зьніжэньня на замежных біржах курсу вэнгерскіх папер і моцнага пагоршаньня агульнага фінансавага становішча ўнутры краіны. (ТАСС).

„Эканомія" за кошт працоўных
Сотні мільёнаў марак на падтрыманьне банкаў

БЭРЛІН, 13. У бюджэтнай камісіі рэйхстагу германскі міністар фінансаў Дзітрых намаляваў карціну далейшага рэзкага пагоршаньня становішча дзяржаўных фінансаў Германіі. **Агульны дэфіцыт германскага бюджэту дасягнуў ужо 2,5 млрд. марак,** з якіх 1,7 млрд. складаюць недабор па мытных і падатковых паступленьнях і 800 млн. марак—перавыдатак звышбюджэтных памячэньняў. У сучасны момант асноўнай задачай, паводле слоў Дзітрыха, зьяўляецца пакрыцьцё новага дэфіцыту ў разьмеры 400-450 млн. марак шляхам мер «эканоміі» і павышэньня падатку на зварот. Дзітрых падкрэсьліў, што зарплата дзяржаўных служачых ужо зьніжана двума надзвычайнымі дэкрэтамі на 20 проц. Далей Дзітрых заявіў, што неабходна будзе правесьці далейшыя меры «эканоміі».

Гэтыя новыя меры прадстаўляюць сабой новы цяжкі ўдар па жыцьцёвым узроўні працоўных. Намечаная «эканомія» будзе дасягнута за кошт дапамог, якія атрымліваюцца сваякамі загінуўшых на вайне («эканомія» ў 41 млн. марак), дапамог па інвалідзнасьці (51 млн. марак), расходаў на лячэньне застрахаваных (3 млн. марак), дапамог удовам і сіратам (3 млн. марак), расходаў на дапамогу беспрацоўным (5 млн. марак), расходаў на перасяленьне беспрацоўных у вёскі (1 млн. марак) і расходаў па харчаваньне ў школах дзяцей незаможных (3 млн. марак). Дзітрых павінен быў адначасова прызнаць, што рост дэфіцыту германскага бюджэту выклікан таксама расходамі дзяржавы на падтрыманьне збанкрутаваўшых банкаў і іншых прадпрыемстваў. У прыватнасьці, на падтрыманьне Дрэзьдэнскага банку было выдаткавана 300 млн. марак, на падтрыманьне данатбанку—35 млн. марак, на падтрыманьне шродэрбанку ў Брэмене—189 млн. марак, германскага арыентальнага банку—15 млн. марак і г. д. Нарэшце, дзяржава ўвесла 200 млн. марак у новаарганізаваны акцэптна-гарантыйны банк, спэцыяльна створаны для падтрыманьня прамысловасьці.

Тэрор у Баўгарыі

Тэрор супроць рэвалюцыйных рабочых і сялян у Баўгарыі ўсё больш узмацняецца. Ва ўсіх буйнейшых гарадох Баўгарыі праводзяцца масавыя вобыскі і арышты. У турмах да палітычных зьняволеных ужываюцца жахлівыя катаваньні.

Паліцыя ў сваім паведамленьні падае, што ёю нібы арыштован другі член Пэнтральнага Камітэту нелегальнага саюзу камуністычнай моладзі. Імя арыштаванага трымаецца ў таямніцы. Арыштован камуніст Башылаў. Каля двух год таму назад паліцыя выкрыла на кватэры Башылава тайную друкарню, але Башылаву ўдалося тады схавацца.

17-га лістапада ў Сьлівене праведзены масавыя арышты. Паліцыя ў часе вобыскаў страляла ў вокны рабочых кватэр. Групе рабочых, якім пагражаў арышт, удалося ўцячы. Адзін з арыштаваных рабочых Тодар Спас прабаваў пакончыць самагубствам у турме, перарэзаўшы на руках жылы.

Масавыя арышты і катаваньні арыштаваных выклікалі хвалю абурэньня сярод працоўных мас. Некалькі соцень студэнтаў у Сафіі прынялі ўдзел у дэманстрацыі пратэсту супроць паліцэйскага тэрору. У адказ на тэрор, рабочыя масамі ўступаюць у камуністычную партыю, якая з кожным днём усё больш узмацняе свае рады.

Расстрэл сялян у Грэцыі

ПІРГОС. 20.000 сялян, якім была абяцана кампэнсацыя страт, прычыненых марозамі, арганізавалі дэманстрацыю ў горадзе Піргосе з патрабаваньнем дапамогі. Паліцыя і кавалерыя напалі на дэманстрантаў. Пяць сялян забіта і звыш 50 паранены, паранены таксама 3 паліцэйскія.

Адбылася партканфэрэнцыя добрускай фабрыкі

ГОМЕЛЬ. (Па тэлеграфу).

Учора адбылася партыйная канфэрэнцыя добрускай папяровай фабрыкі. З дакладам ЦК выступіў тав. Гантман.

Канфэрэнцыя аднадушна ўхваліла палітычную лінію ЦК, а таксама меры па абнаўленьні кіраўніцтва фабрыкі. У пастановах канфэрэнцыі вызначаны практычныя мерапрыемствы па неадкладным пуску фабрыкі.

Брыгада «Зьвязды»:
Манькоў, Карачун, Самуцін.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Трацкісцкі кантрабандыст Слуцкі выключан з партыі

МАСКВА, 14. Парткалегія Краснапрэсьненскага райкому абмеркавала пытаньне аб Слуцкім, які напісаў антыпартыйны трацкісцкі артыкул «Бальшавікі нямецкай сацыял-дэмакратыі ў перыяд яе перадваеннага крызісу», зьмешчаны ў часопісі «Пролетарская революция» № 6 за 1930 год. Парткалегія канстатавала, што артыкул Слуцкага зьяўляецца трацкісцкім скажэньнем вузлавых пытаньняў гісторыі бальшавізму і трацкісцкім паклёпам на Леніна і нашу партыю. Парткалегія канстатавала, што спробы Слуцкага спасылацца на свае «добрыя суб'ектыўныя намеры» фактычна азначаюць імкненьне Слуцкага зьняць з сябе адказнасьць за прапаганду трацкізму, якая ім праводзілася. Парткалегія лічыць, што працягваньне Слуцкім контр-рэвалюцыйнай, трацкісцкай кантрабанды зьяўляецца невыпадковым. Парткалегія ўстанавіла, што выступленьне Слуцкага бязумоўна зьвязана з яго меншавіцкім мінулым, і расцэньвае артыкул Слуцкага, як сьвядомае выкарыстаньне партыйнай літаратуры для прапаганды трацкізму, які зьяўляецца перадавым атрадам контр-рэвалюцыйнай буржуазіі.

Парткалегія пастанавіла:

Слуцкага, служачага-інтэлігента, які мае вышэйшую адукацыю, кандыдата партыі з 15 лістапада 1930 году, выкінуць з меншавіцкай партыі, за антыпартыйнае выступленьне ў друку з мэтай дыскрэдытацыі Леніна і нашай партыі, за сьвядомае скарыстаньне партыйнай літаратуры для фальсыфікацыі гісторыі бальшавізму і працяваньня трацкісцкай кантрабанды —**з кандыдатаў партыі выключыць.**

Трэці дзень дэкадніка Камакадэміі

На трэцім пасяджэньні, прысьвечаным дэкадніку Камуністычнай Акадэміі ў БССР, якое адбылося 13-га сьнежня ў Доме Камасьветы, тав. **ГАТАЎСКІ** зрабіў даклад на тэму—«**Праблема гросшай і рыначных адносін на новым этапе**».

Тэарытычна ўгрунтоўваючы праблему грошай, таваразвароту і рыначных адносін у новай абстаноўцы сацыялістычнага будаўніцтва, дакладчык значную ўвагу аддаў формам і мэтадам савецкага гандлю, ажыцьцяўленьню пасьці ўмоў тав. Сталіна, пытаньням гаспадарчага разрахунку і г. д.

Даклады адбываюцца пры перапоўненай залі і трансьлююцца па радыё.

Усебеларуская нарада па пытаньнях кадраў 5 студз. 32 г.

Па пастанове ЦК КП(б)Б на 5-га студзеня 1932 г. у Менску склікаецца УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПА ПЫТАНЬНЯХ КАДРАЎ.

У парадку дня нарады стаяць наступныя пытаньні:

1. Вынікі і чарговыя задачы па выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па пытаньнях кадраў.

2. Кантрольныя лічбы па кадрах на 1932 г.

3. Становішча ВТНУ і ВНУ БССР і пляны іх разьвіцьця на бліжэйшы пэрыяд.

4. Аб падрыхтоўцы масавых калгасных кадраў. Акрамя таго ў сэкцыях нарады будуць прапрацаваны наступныя пытаньні:

а) Аб сыстэме размеркаваньня кадраў і стварэньні рэзэрву.

б) Аб падрыхтоўцы кадраў для тарфяной прамысловасьці на 32 г.

в) Аб падрыхтоўцы кадраў прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў на 1932 г.

г) Аб падрыхтоўцы саўгасных, жывёлагадоўчых і ільнаводчых кадраў.

д) Аб падрыхтоўцы кадраў сельсаветаў.

е) Аб падрыхтоўцы кадраў спачывецк. каапэрацыі.

ж) Аб рабоце райкомаў у галіне кадраў.

На нараду выклікаюцца загадчыкі аддзеламі кадраў ГК,—загадчыкі аргаддзелаў 45 райкомаў, дырэктары і сакратары парткалектываў ВТНУ, ВНУ, 10 дырэктароў тэхнікумаў, 8 дырэктароў прамысловасьці і новабудоўляў, 10 дырэктароў саўгасаў, 10 работнікаў па кадрах сыстэмы Калгасцэнтру і Трактарацэнтру і кіраўнікі аддзеламі кадраў усіх цэнтральных устаноў.

Для падрыхтоўкі гэтай нарады Сакратарыятам ЦК выпучана спэцыяльная камісія.

Да другой сэсіі ЦВК БССР X скліканьня.

Другая сэсія ЦВК БССР X скліканьня адбудзецца **15 сьнежня** 1931 г. у гор. Менску, у клюбе харчавікоў.

ПАРАДАК ДНЯ НАСТУПНЫ:

1) Даклад СНК БССР аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі БССР на 1932 год.
2) а) даклад СНК БССР аб дзяржбюджэце БССР на 1932 год, б) суседаклад бюджэтнай камісіі ЦВК БССР па дзяржаўным бюджэце на 1932 год.
3) Даклад Клюшьнага, Заслаўскага і Лельчыцкага РВК аб гаспадарчым і культурным будаўніцтве раёнаў.
4) Даклад Калгасцэнтру БССР аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.
5) Аб масавай рабоце саветаў.
6) Зацьвярджэньне важнейшых пастаноў, прынятых паміж сэсіямі ЦВК БССР

Сакратар ЦВК БССР **М. Гіляновіч.**

РЫХТУЕЦЦА да пастаноўкі новы ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

Гукавы Кіно-Тэатр „Чырв. Зорка"

ШТОРМ

У гал. ролі: Народн. арт. Рэсп. Нефцаў. У гал. ролі: Арт. Мхат. Янышын. У гал. ролі: Арт. Тэат. Рэвал. Лаўранцьеў. У гал. ролі: Арт. Тэатру Рэвал. Пляцкоў.

Сачэце за рэклямай.

Кіно „КУЛЬТУРА".

Ад 15-га сьнежня новая мастацкая ўсходняя драма

АНУШ

Рэжысэр ПЭРЫСЬЦЯН! У гал. ролі Нова АРДВУШАНЯ

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: ЛОДЫРАМ КАНЕЦ у 1-й частцы.

Пачатак: 7, 8-45 і 10-30.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса—з 1 г. дня. Новы мастацкі фільм ЧАЛАВЕК З ТУРМЫ Пач.: 5-45, 7-30, 9, 10-20.

Інтэрнацыянал Адкр. з 12 г. дня. ЭЛЕН РЫХТЭР у камэдыі МАРАЛЬ. Звыш праг. кіно-хроніка Саюзкіно

„Пралетары" Адкр. з 12 г. дня Гарольд Лойд у замежным фільме МАЛОДШЫ СЫН.

„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") Мастацкі фільм ПАРТФЭЛЬ ДЫЛЯКУР'ЕРА Звыш праг.—хроніка. Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. дня.

„СПАРТАК" Пач. 7-15, 9, 10-45 Чырвоны старт у 6 частках. Звыш праграмы Дзеравянае золата

16 сьнежня, ў 6 гадз. веч., у памяшк. клюбу Саўгандальслужачых (рог Камуністычнай і Энгельса) склікаецца

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПРАФАКТЫВУ

з наступным парадкам дня:

1. Даклад аб выніках перавыбараў ФЗМК і чарговых задачах прафарганізацыі.
2. Вынікі конкурсу на лепшым правядзеньні перавыбараў.

Пасьля дакладаў—мастацкая частка.

Прапануецца старшыням ФЗМК забясьпечыць яўку прафактыву, атрымаўшы запрашальныя білеты у ГСНС.

Прэзыдыум Гарпрафсавету

Сэктар Народна-Гаспадарчага Вучоту Дзяржпляну БССР СКЛІКАЕ на 17 сьнежня, у 6 г. вечара, у пам. ленінуту Дзяржпляну (пляц Волі № 5).

КАНФЭРЭНЦЫЮ

кіраўнікоў сэктароў вучоту і статыстыкі, наркаматаў і цэнтральных устаноў БССР

Парадак дня: 1. Арганізацыя вучотна-статыстычных работ (дакл. тав. Кашэльсон).
2. Даклады кіраўнікоў сэктароў: а) ВСНГБ, б) НКЗему, в) Белкавпсаюзу.
3. Выкананьне пляну вучотна-статыстычных работ за 1931 г. і плян работ на 1932 г. (дакл. тав. Шынддер).
4. Мэханізацыя вучотна-статыстычных работ (дакл. тав. Магідаў)

На канфэрэнцыю павінны зьявіцца кіраўнікі сэктароў, галоўбухі або бухгальтары-інструктары.

Запрашаюцца прадстаўнікі Бел. АРУ, ВОРС.

Аргрупа Сэктару Народна-Гасп. вучоту.

Калектыў і адміністрацыя ВСНГ БССР выказваюць спачуваньне сям'і памёршага супрацоўніка **тав. ЗМАЧЫНСКАГА,** які зьяўляўся прыкладным супрацоўнікам і прэміяваным ударнікам

Камсамольская ячэйка і калектыў супрацоўнікаў Беларускай Дзяржаўнай бібліятэкі выказваюць сваё спачуваньне т. ТАУБЭ Э. Ю. з прычыны сьмерці **яе мужа КАРПОВІЧА.**

Кошт публікацыі аб згубе дакум. 1 руб.

ПЫТАНЬНІ ПОЛУ

ПАЛАВОГА ВЫХАВАНЬНЯ ШЛЮБУ І СЯМ'І

Альбом у трох частках (больш 1.300 малюнкаў)

Пад рэдакцыяй праф. В. І. Таліева, Н. Н. Юрдзінскага, С. Я. Вальфсона і пры ўдзеле праф. Т. П. Сахарова і праф. Н. Сарокіна.

Да альбому дадаецца сем кніг (1116 стар. тэксту)

Цана альбому ў папцы з усімі дадаткамі 30 р. Высылаецца толькі па атрыманьні задатку не менш 10 руб.

Москва, Г. С. П. 10, Моховая вул., д. № 26, кв. [illegible] Проспект, с-ва „ПРОМЕТЭЯ".

Увага: Свае адрасы пішэце на купонах перавоўнаў дакладна і ясна.

Выдавецтва Ц КП(б)Б „ЗЬВЯЗДА"

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1932 г.

на часопісь падтыкі і практыкі ПАРТЫЙНАЙ ПРАЦЫ

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ

Орган ЦК КП(б)Б

24 У 1932 ГОДЗЕ будзе выходзіць ДВА РАЗЫ Ў М-Ц. 24 нумары у год

Кожнаму партыйцу, актывісту, прапагандысту неабходна чытаць „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"

Падпісная цана на 1932 г. на 1 мес.—40 к. на 6 м.—2 р. 40 к. на 3 „ 1 р. 20 „ на 12 „—4 „ 80 к.

Падпіска прымаецца: на пошце, лістаносцамі і упаўнаважанымі па друку ва ўсіх прадпрыем. і ўстановах БССР.

ПРЫ РАСЬНЯНСКІМ ВЭТТЭХНІКУМЕ

адкрываецца 10-месячныя КУРСЫ тэхнікаў-ветэрынараў.

Прымаюцца калгаснікі і рабочыя з адукацыяй ШКМ, а таксама, якія маюць практычны стаж па ветэрынарыі, па камандыроўках райкалгассаюзаў.

Стыпэндыя і інтэрнат прадастаўляюцца.

Прыём заяў да 20/XII-31 г. Таксама прымаюцца заявы ў дадатковую групу ветэтэхнікуму.

Заявы накіроўваць: м. Расна Мсьціслаўскага раёну, Ветэтэхнікуму

Дырэкцыя

Беларускае аддзяленьне кн'гацэнтру „ОГИЗ РСФСР"

АДКРЫЎСЯ АДДЗЕЛ „КНІГА-СПАЖЫЎЦУ".

Пры заказе ўсялякая кніга, якая ёсьць на кніжным рынку ў аднадзенны тэрмін будзе выслана накладкой платай

ЗАКАЗЫ НАКІРОЎВАЦЬ ПА АДРАСЕ: МЕНСК, „КНІГА-СПАЖЫЎЦУ"

„ЗА ТЕМПЫ КАЧЕСТВО, ПРОВЕРКУ"

ДВУХТЫДНЕВАЯ КІРУЮЧАЯ ЧАСОПІСЬ

ОРГАН ЦКК-РСІ СССР, пад рэдакц. Ем. Яраслаўскага.

ЧАСОПІСЬ мабілізуе ўвагу мас на праверцы выкананьня пастаноў партыі і ўраду, на паляпшэньне работы ўсяго дзяржаўнага, гаспадарчага і каапэрацыйнага апарату і асаблівую ўвагу аддае прыцягненьню мас да кіраваньня дзяржавай і барацьбе з бюракратызмам.

ЧАСОПІСЬ разьлічана на работнікаў КК РСІ і на шырокі актыў, які прымае ўдзел у масавым пралетарскім кантролі і садзейнічае рабоце РСІ, на работнікаў шэфскіх брыгад, сэкцый РСІ садзейнасьці РСІ на прадпрыемствах, у саўгасах, калгасах, лёгкую кавалерыю, а таксама на гаспадарнікаў, партыйцаў і прафсаюзных работнікаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на 1932 ГОД праводзіцца ўсюды на пошце.

Падпісная цана: — на 12 мес. (24 №№)—7 руб. — „ 6 „ —3 „ 50 к. „ 3 „ —1 „ 75 к.

Адрас: Изд-во „ТЕХНИКА УПРАВЛЕНИЯ" Москва, Центр, Ильинка, Рыбный пер. 2, пом. 28.

Менск, друкарня газ. «ЗЬВЯЗДА». Галоўлітбел № 337.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2